Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 КРАСАВІКА 2021 г. СЕРАДА № 74 (29443)

АД СТАГОДДЗЯ ДА СТАГОДДЗЯ

ЧЫРВОНКА

СЛОВА КЛІКАЛА Ў БОЙ

ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Аграрыі вобласці завяршылі сяўбу ранніх яравых і зернебабовых культур (без кукурузы, грэчкі і проса). У цэлым пасяўная кампанія 2021 года прайшла 50-працэнтны рубеж. Па планах на 10 мая сяўба будзе завершана».

КАРАТКА

- Лукашэнка падпісаў указ аб арганізацыі ўступнай кампаніі ў 2021 годзе. У адпаведнасці з дакументам створана дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў, старшынёй прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.
- **Унесены змены ў заканадаўства па пытаннях валютнага рэгулявання і кантролю.**
- БДТУ стаў паўнапраўным членам Асацыяцыі тэхнічных універсітэтаў.
- **КДК Гродзенскай вобласці выявіў завышэнне цэн на сацыяльна значныя тавары больш чым у 20 крамах.**
- Адкрыццё новай лядовай арэны ў Віцебску пераносіцца на другую палову 2022 года.
- У Беларусі больш за 50 % прыродных комплексаў і экасістэм захаваны ў натуральным стане.

- **Тры паласы руху грузавікоў закрыты з-за рэканструкцыі пункта пропуску «Мядзінінкай».**

ISSN 1990 — 763X

Першыя ластаўкі вясновай Прыпяці

Вяслярная база мазырскага філіяла Гомельскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву знаходзіцца на маляўнічым беразе Прыпяці. Кожны дзень двойчы, зранку і пасля паўдня, не зважаючы на надвор'е, навучэнцы ўстановы трэніруюцца на сваіх лёгкіх хуткасных байдарках і каноэ на прыпяцкай плыні — палеская Амазонка дапамагае юнакам і дзяўчатам адточваць вяслярнае майстэрства.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Па палічках

Крыптавалюта для «чайнікаў»

Што гэта такое і дзе ды як захоўваць?

Легалізацыя крыптавалют, згодна з Дэкрэтам кіраўніка дзяржавы № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі», значна палепшыла дадзеную сферу бізнесу. Паняцце ўвайшло ва ўжытак, навіны па тэме б'юць рэкорды, рост каціровак віртуальнай валюты прыкоўвае да сябе ўвагу. Аднак для многіх жыхароў нашай краіны яна так і засталася «цёмным лесам», выклікаючы здзіўленне і неразуменне. Асноўныя паняцці «крыптавалютных» тэм нам растлумачыць эксперт рынку і дырэктар правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.

СТАР. 4

З нагоды

ЧЫРВОНКА гадоў Чырвоная змена

СЁННЯ «ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЕ» — 100!

Мінаюць дзесяцігоддзі, змяняюцца эпохі, прагрэс няўхільна ўжо не крочыць, а літаральна бяжыць наперад... З моманту выхаду першага нумара «Чырвонай змены» прайшло цэлае стагоддзе, але яна, насуперак часу, засталася ўсё тая ж — заўсёды маладая.

Моладзь ёсць ва ўсе часы — з усімі яе праблемамі і дасягненнямі, юнацкім максімалізмам і марамі, крэатывам і запалам. Пакаленні змяняюць адно аднаго, але кола яе пытанняў заўсёды застаецца нязменным і актуальным. І менавіта ў гэтым заключаецца сакрэт заўсёднай маладосці «Чырвонай змены»: яна піша найперш пра юнакоў і дзяўчат, якія менавіта ў бягучы прамежак нашай агульнай гісторыі — учора, сёння і заўтра — рухаюць жыццё наперад. Яны нашы галоўная героі ва ўсе часы існавання газеты. Застаючыся вернай традыцыям ранейшых пакаленняў, цяперашняя «Чырвонка» карыстаецца адным простым, але дзейсным правілам: маладыя пішуць пра маладых для маладых.

Пакаленні не могуць быць цалкам лепшыя або горшыя за папярэднія ці наступныя. Яны проста іншыя, адрозныя адно ад аднаго. Кожнае з іх прыўносіць нешта сваё ў агульную скарбонку тварэння, памяці, традыцый. І вось ужо цэлае стагоддзе «Чырвоная змена», гэтаксама прымаючы эстафету ад сваіх папярэднікаў-журналістаў, знаходзіцца ў віры ініцыятыў таленавітых юнакоў і дзяўчат. І як ёй не заставацца заўсёды маладой?!

Пра тое, якая «Чырвоная змена» была раней і якая яна цяпер, чытайце на старонках яе юбілейнага выпуску.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ НЕ БУДЗЕМ ЛОБ У ЛОБ ПА НЕЙКІХ ПЫТАННЯХ СУТЫКАЦЦА З УКРАІНАЙ»

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з дэпутатам Вярхоўнай Рады Украіны Яўгенам Шаўчэнкам

Сустрэча ў Палацы Незалежнасці з прадстаўніком палітычнага істэблішменту Украіны — падзея для апошняга часу амаль што неверагодная. Са жніўня мінулага года падыходы афіцыйнага Кіева да супрацоўніцтва з Беларуссю значна змяніліся. Адменены запланаваныя візіты першых асоб, перанесены трэці Форум рэгіёнаў, спынены кантакты дзяржструктур. Таму да размовы Аляксандра Лукашэнкі з народным дэпутатам Вярхоўнай Рады Украіны Яўгенам Шаўчэнкам асаблівая ўвага. Абмяркоўвалі падчас яе многія тэмы — Данбас, перанос пляцоўкі трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне, гандаль, адносіны да ўкраінцаў у Беларусі.

«Прыемна з вамі сустрэцца. Аказваецца, ёсць яшчэ ва Украіне людзі, якія паважаюць Беларусь», — пачаў размову з парламентарыем Аляксандр Лукашэнка.

«Не проста паважаюць, а любяць і цэняць. Для мяне вялікі гонар з вамі пазнаёміцца. Я даўно марыў», — адказаў Яўген Шаўчэнка.

Прэзідэнт Беларусі працягнуў, што гэтая сустрэча вельмі важная для яго.

«Па-першае, гэта падстава паразмаўляць пра беларуска-ўкраінскія адносіны. Бо мы мала размаўляем на гэтую тэму. А калі размаўляем, то не заўсёды пазітыўна. Ведаю, што адбываецца на маёй роднай Украіне. Вы ведаеце мае адносіны да Украіны і не толькі як Прэзідэнта, але і мае асабістыя адносіны, таму вельмі важная гэтая сустрэча як добры сігнал. Я спадзяюся, што гэта будзе добры сігнал, выходзячы з таго, што я ведаю пра вас і вашу пазіцыю адносна беларуска-ўкраінскіх адносін і ўвогуле ў дачыненні да Беларусі», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што гэта будзе добры пачатак супрацоўніцтва сапраўдных патрыётаў Украіны з Беларуссю.

«Мы ніколі нічога не хавалі ад нашых украінскіх сяброў, хаваць не маем намеру і далей. Тым больш ад нашых сяброў. Я думаю, што іх паменела, але наўрад ці. Пра іх менш гавораць і яны менш гавораць апошнім часам. Але не думаю, што ў нас там менш сяброў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

ГАНДАЛЬ — ГЭТА АСНОВА

Асобна спыніўся Прэзідэнт на гандлёвых адносінах, адзначыўшы, што тавараабарот з Украінай складае пад пяць мільярдаў долараў. «Вы ж ведаеце, што мы ніколі нават у гэтай сітуацыі не рабілі дрэнната для Украіны. Усё, што Украіна прасіла па электрычнасці, калі была праблема, было маё асабістае распараджэнне — перадаць электраэнергіі колькі трэба Украіне. Тэлефанаваў раней Зяленскі. У яго ішла пасяўная кампанія і спынілася тэхніка, бо не было паліва. Мы паздымалі паліва са сваіх прадпрыемстваў і перакінулі летась на пасяўную ўкраінцам», — нагадаў кіраўнік краіны.

Па яго словах, і цяпер беларусы дапамагаюць суседнім украінскім абласцям, але з-за закрыцця граніцы менш. А раней увогуле перакідвалі тэхніку: і сеялі, і ўбіралі з суседзямі.

«Гатовыя і цяпер гэта рабіць. Не пытанне, калі ў нас ёсць нейкія магчымасці. Але што мяне насцярожвае — гэтыя антыдэмпінгавыя разборкі. На 300 мільёнаў долараў тавараў фактычна налажылі забарону. А калі мы закрыем для Украіны некаторыя пазіцыі? Вы ж разумееце, што Еўрасаюз у вас усё не возьме. Не возьме нават тое, што паабяцаў. Ён дае вам гадавую квоту, што вы выбіраеце за першы квартал. Гэта мне Зяленскі расказваў. А што далей?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, краінам не варта нацягваць адносіны ў гандлі. «Гэта база. Аснова. Калі не будзе тавараабароту (ён у нас больш-менш збалансаваны), якія тады могуць быць адносіны ў іншых сферах?» — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка абурыўся, што ў мінулым годзе Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны быў сарваны. На яго думку, дзякуючы міжрэгіянальным кантактам знаходзяцца адказы на пытанні, якія не могуць быць вырашаны ўрадамі.

«НЕ ЛІЧУ УКРАІНУ ЧУЖОЙ»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь не мае намеру псаваць адносіны з краінай-суседкай.

«Мы не будзем лоб у лоб па нейкіх пытаннях сутыкацца з Украінай і паводзіць сябе непрыстойна, але дзесьці мы вымушаныя рэагаваць, калі далей няма куды і пераходзяцца забароненыя чырвоныя лініі. Але мы не хочам дрэнных адносін з нашай паўднёвай суседкай. Я не лічу Украіну чужой», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка ў размове з дэпутатам адрэагаваў на заявы некаторых украінскіх дзеячаў пра магчымасць перанесці з Мінска перагаворы трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне.

«Вы што, лічыце, што работа трохбаковай групы — гэта падарунак Лукашэнку? Не, тады прасіў Прэзідэнт Парашэнка, і Пуцін, усе згадзіліся. У Мінску блізка, забяспечвалі ўсё, што толькі ўкраінцы хацелі. Кажуць, ёсць жаданне ў іншае месца перанесці. Калі гэта Украіне выгадна і пойдзе на карысць, мы будзем толькі вітаць, — сцвярджае беларускі лідар. — Але я не разумею, навошта ехаць за край свету? Навошта гэта рабіць? Гэта чыста палітычная вакханалія. Паверце, мы асабліва не парымся на гэты конт. Проста прыкра за Украіну, што гэты працэс можа зацягнуцца ці разбурыцца. Гэтага рабіць нельга».

Ён расказаў, як добра адносяцца беларускія людзі да ўкраінцаў і якія створаны ўмовы для іх пражывання. «Калі ў вас пачуўся канфлікт на Данбасе, мы аднамомантна прынялі 150 тысяч украінцаў. Хтосьці вярнуўся, многія працаўладкаваліся тут, і ўказ я падпісаў, надаўшы роўныя правы ўкраінцам, што прыехалі ў Беларусь. Гэта вы ведаеце, вялікі сацыяльны пакет: бясплатная адукацыя, медыцынскае абслугоўванне, працаўладкаванне. 150 тысяч прыняць няпроста. Вы бачыце, як у Еўрасаюзе мігранты прыбываюць, а яны не могуць дзве тысячы чалавек падзяліць, каб рассяліць», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

ПРА МІР НА ДАНБАСЕ

Кіраўнік краіны выклаў дэпутату Вярхоўнай Рады свае нязменныя погляды на сітуацыю ва Украіне.

«Вы ведаеце маю пазіцыю па Украіне, яна застаецца нязменнай. Я вельмі хацеў бы, каб Украіна была наша, каб мы як тры славянскія і брацкія народы былі разам на карысць народаў. Ніхто не збіраецца рабіць рабамі адзін аднаго. Ніхто не збіраецца сціснуць адзін на аднаго. Палітыка ёсць палітыка, і могуць быць розныя нюансы. Таму ў палітыцы перамагае не проста моцны, а той, хто разумнейшы і можа выкарыстаць сітуацыю, каб павярнуць яе ў лепшы бок. Я маю на ўвазе сітуацыю на Данбасе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што глыбока пагружаны ў праблемы Украіны і дадзеная тэма заўсёды закранаецца падчас перагавораў з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным.

«Заўсёды, калі прасіў у мяне былы Прэзідэнт Украіны, ды і з гэтым Прэзідэнтам, калі мы сустракаліся. Калі былі просьбы абмеркаваць пытанні ў Расіі, дзесьці выступіць (чаго я вельмі не люблю) нейкім пасярэднікам, я заўсёды гэта рабіў. І з Уладзімірам Пуціным, Прэзідэнтам Расіі, у мяне было шмат размоў пра Украіну. Якая б ні была ў мяне сустрэча з Пуціным, мы заўсёды гаворым пра Украіну. І паверце, са шчырым жалем мы кажам пра тое, што адбываецца на Украіне і вакол яе», — заявіў кіраўнік краіны.

Ён расказаў, што вырашэнне праблем Данбаса залежыць толькі ад самой Украіны.

«Я вам шчыра скажу: нармалізацыя сітуацыі ў праблемных пунктах Украіны, перадусім на Данбасе, залежыць толькі ад Украіны. Заўтра, калі пайсці па Мінскіх пагадненнях, дзесьці крыху зачэпіць у кагосьці нервы, украінскія нейкія інтарэсы, але, паверце, у сярэднетэрміновай перспектыве Украіна выйграе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён паведаміў, што асабіста пралічваў гэтыя варыянты з былым і сённяшнім прэзідэнтамі Украіны. «Я разумею, твар хочуць захаваць і адны, і другія, але трэба разумець, што Расія — велізарная краіна і яна вельмі шмат чым можа дапамагчы Украіне ў плане адналення Данбаса», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, такія прапановы былі ад Уладзіміра Пуціна і іх прасілі перадаць Пятру Парашэнку. «Я яму расказаў, усё далажыў. Я тады ўпершыню зразумеў адназначна, што палітыкі і кіраўніцтва Украіны несамастойныя. Трэба было прымаць рашэнні і крок за крокам рухацца. І ўжо да гэтага часу шматлікія пытанні былі б знятыя. Я быў сведкам: не Пуцін у гэтым вінаваты, ён прапанаваў. Добрыя былі прапановы. Але былы прэзідэнт адмовіўся», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ У тэму

Яўген Шаўчэнка яшчэ раз падкрэсліў: для яго знакавая падзея, калі Прэзідэнт прымае простага дэпутата.

«Вы не просты дэпутат. Вы прыхільнік нашых адносін. Мы бачылі, як вы не баяліся ісці супраць плыні, таму што лічылі, што беларуска-ўкраінскія адносіны на стагоддзі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах парламентарыя, Украіна перажывае падзеі, якія былі характэрныя для Кіеўскай Русі: раздрабленне брацкіх народаў і перашкоды ад знешніх гульцоў. Але ён упэўнены, што нашы народы роднасныя.

«Я лічу, што Украіна і Беларусь — два самыя блізкія народы. І хто б ні быў каля ўлады, і што б ні адбывалася, гэтыя народы не падзяліць. Мяне многія могуць абвінаваціць, што я кажу за ўвесь украінскі народ, але я ведаю і сацыялогія гэта паказвае, што ўкраінцы ў сэнсе палітычнай нацыі — усе нацыянальнасці, што пражываюць ва Украіне, — любяць Беларусь і беларускі народ. Яны ўнутрана, нават калі не могуць сказаць гэтага, супраціўляюцца таму, што адбываецца. Я проста выказваю меркаванне гэтых людзей. Іх вельмі шмат», — дадаў Яўген Шаўчэнка.

У размове з журналістамі ён расказаў, што заявы наконт выхаду ўкраінцаў з мінскай пляцоўкі перагаворыў наконт падзей на Данбасе неафіцыйныя.

«Няма ніякай іншай альтэрнатывы. Акрамя чутак. Таму сёння пазіцыя, якая была ва Украіны, наколькі мне вядома, ранейшая і застаецца. Я не бачу тут ніякіх падстаў для хвалявання», — сказаў народны дэпутат Вярхоўнай Рады.

Парламенцкі дзённік

Злачынства супраць усёй Рэспублікі Беларусь

Члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў з глыбокім абурэннем успрынялі інфармацыю пра спробу дзяржаўнага перавароту ў Беларусі, спалучанага з фізічным знішчэннем першых асоб дзяржавы і іх блізкіх сваякоў, гаворыцца ў апублікаванай заяве.

«Падрыхтоўку такіх дзеянняў трэба разглядаць як тэрарыстычны акт і злачынства супраць усёй Рэспублікі Беларусь. Перадумовай гэтага злачыннага намеру стала няўхільнае разбурэнне асноў і традыцыйных прынцыпаў міжнароднага права. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў шэраг дзяржаў умешваецца ва ўнутраныя справы іншых краін, прыкрываючыся скажонымі ўяўленнямі пра абарону свабод і дэмакратычных каштоўнасцяў, — гаворыцца ў заяве. — У штодзённую практыку ўведзена выкарыстанне санкцый і іншых мер эканамічнага ціску. Шырокае распаўсюджанне атрымала арганізацыя «каляровых рэвалюцый» для звяржэння законна абраных органаў улады ў суверэнных дзяржавах. Усюды такія дзеянні прыводзілі да разбурэння, знішчэння нацыянальных традыцый і дзяржаўнасці, жабрацтва і гібелі людзей».

Парламентарыі рашуча асуджаюць любыя спробы гвалтоўнага звяржэння дзяржаўнай улады і заклікаюць міжнародную супольнасць неадкладна адмовіцца ад падтрымкі любых дэструктыўных сіл, якія дэстабілізуюць унутрыпалітычную абстаноўку ў Беларусі.

ООО «Фрондера»
извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт» в форме открытого аукциона

№ Лота	Наименование предмета торгов и его местонахождение	Начальная стоимость без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 600/D-94120, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Зеленая, 1В-111, площадь – 40,8 кв. м, назначение – квартира, наименование – квартира	101 000,00	10 100,00	5 050,00

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги после оценки

Дата и время проведения открытого аукциона	**24 мая 2021 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1127
Начало приема заявлений – в 10.00 21.04.2021. Окончание приема заявлений в 18.00 21.05.2021	
Условия для участия в торгах	1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000,** код банка ALFABY2X УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт», назначенных на __.__.2021, по Лоту №___. Срок внесения задатка: – с 21.04.2021 в 10.00 по 21.05.2021 в 16.00. 2. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info/ 3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо для подачи заявлений +375293082897 Анаида. 4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, где указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (5 % от конечной цены предмета торгов) и затрат по размещению публикации в газете на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. 5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 6. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. 7. Контактное лицо для ознакомления с имуществом +375293042560 Андрей. 8. Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона
Информация о продавце	Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90)
Организатор торгов	ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 ● e-mail: info.torgi@orgtorg.by ● сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127

белагропромбанк
традиции будущего

С 21 апреля 2021 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 14.04.2021 № 94 ставка рефинансирования устанавливается в размере 8,5 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 0,75 процентного пункта с 21 апреля 2021 года.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

На вастрыні праблемы

Змагацца за жыццё кожнага чалавека

Учора старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла чарговую нараду з кіраўніцтвам Міністэрства аховы здароўя, работнікамі медыцынскіх установаў, вядомымі навукоўцамі-медыкамі і спецыялістамі-практыкамі ў сферы барацьбы з пандэміяй.

Па словах старшыні Савета Рэспублікі, ніякіх надзвычайных прычын для сустрэчы не было. Проста надышоў час абмеркаваць у рабочым рэжыме шэраг злабадзённых пытанняў, якія напрамую датычацца тактыкі лячэння небяспечнай віруснай інфекцыі ў нашай краіне. Бо сітуацыя не стаіць на месцы, узнікаюць новыя праблемы, асобныя людзі двойчы, а некаторыя ўжо і тройчы захворвалі на COVID-19. Стаіць задача змагацца за жыццё кожнага чалавека. Таму сёння вельмі важна абмяняцца думкамі і меркаваннямі па коле пытанняў, якія ўяўляюць узаемны інтарэс для спецыялістаў. А таксама вызначыць верагодныя «вузкія» месцы, якія, магчыма, замінаюць барацьбе з пандэміяй, бо спыняюцца на дасягнутым нельга, сказала Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты парламента таксама звярнула ўвагу прысутных на значную ролю СМІ ў справе павышэння інфармаванасці насельніцтва аб віруснай інфекцыі, санітарных мерах перасцярогі супраць заражэння, наступствах гэтага цяжкага захворвання. Бо нават бессімптомнае цячэнне хваробы, якое нярэдка назіраецца ў дзяцей, можа з цягам часу прывесці да вельмі непажаданых наступстваў. З гэтай прычыны Наталля Качанава заклікала суразмоўцаў больш актыўна супрацоўнічаць са сродкамі масавай інфармацыі, даваць аператыўныя каментарыі, актуальную інфармацыю, пераконваць грамадзян у неабходнасці выконваць усе супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы як у калектывах, так і ў месцах масавага знаходжання людзей.

На думку старшыні Савета Рэспублікі, трэба ў СМІ змагацца і з «фэйкамі» на каранавірусную тэму, напрыклад, аб «адмене» даплат медыкам за работу ў «чырвонай зоне».

Фота БелТА.

У размове з журналістамі рэктар Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта Ігар Стома адзначыў, што з часам прыходзіць клінічны досвед у барацьбе з пандэміяй. Сёння ўрачы ўжо больш ведаюць пра каранавірус, яго асаблівасці, спосабы лячэння. Беларускія медыкі валодаюць усімі сродкамі, якія неабходны для лячэння хворых на COVID-19. Зніжаецца паступова ўзрост захварэлых. Калі спачатку больш хварэлі людзі сталыя, то цяпер каранавірус «памаладзеў» і пачаў займаць нішы іншых узростаў: хварэюць людзі сярэдняга ўзросту і маладыя, гаворыць Ігар Стома.

Яго калега прафесар кафедры інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Дзмітрый Данілаў зазначае, што сітуацыя з COVID-19 пакуль не дазваляе расслабляцца. Але, тым не менш, ёсць надзеі на асцярожны аптымізм. Укараненне масавай вакцынацыі дазволіць супыніць распаўсюджванне хваробы. Пры гэтым ён звярнуў увагу на тое, што дыстанцыя і масачны рэжым па-ранейшаму актуальныя.

Леанід ТУГАРЫН.

«Тэрміны выплаты пенсій не змяняліся»

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны патлумачыла, чаму грошы прыйшлі пазней

Учора з'явіліся паведамленні, што ў гэтым месяцы некаторыя людзі атрымалі пенсіі на пару дзён пазней. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пракаментавала сітуацыю.

— Пенсіі штомесяц выплачваюцца ў перыяд з 5 да 26 чысла ўключна, — адзначылі ў ім. — Для выплаты кожнаму пенсіянеру ўстаноўлена пэўная дата, калі пенсія павінна быць выплачана абавязкова. Дата выплаты вызначаецца падчас прызначэння пенсіі і можа быць скарэкціравана пры змене спосабу выплаты пенсіі — праз арганізацыі паштовай сувязі, банкаўскія ўстановы і арганізацыі па дастаўцы пенсій.

Для забеспячэння выплаты пенсій ва ўстаноўленыя тэрміны фінансаванне іх выплаты ажыццяўляецца загадзя. Праз банкі сродкі пералічваюцца, як правіла, за два дні. Пасля паступлення ў банк яны залічваюцца на рахунак пенсіянера і становяцца даступнымі для атрымання. Разам з тым гэты парадак не мяняе ўстаноўленую пенсіянеру дату выплаты пенсіі — тэрмін, не пазней за які пенсія павінна быць выплачана абавязкова, патлумачылі спецыялісты.

— Многія пенсіянеры памылкова лічаць, што дзень залічэння сродкаў на іх рахунак з'яўляецца ўстаноўленай для іх датай выплаты пенсіі. Часта менавіта гэтая акалічнасць з'яўляецца прычынай непаразуменняў і адпаведных паведамленняў. Так, 20 красавіка ў асобных тэлеграм-каналах з'явілася інфармацыя аб парушэнні тэрмінаў выплаты пенсій. Устаноўленая дата выплаты пенсіянерам — 21-е чысло кожнага месяца, — звярнулі ўвагу ў міністэрстве. — З улікам апераджальнага фінансавання сродкі на рахунак у банку залічваліся і былі даступны загадзя, як правіла, за два дні, а ў асобных месяцах — яшчэ і ў больш раннія тэрміны з улікам выхадных і святочных дзён.

У красавіку гэтага года сродкі для забеспячэння выплаты пенсіі 21-га чысла асобным пенсіянерам былі пералічаны ў банкі 20-га — за дзень да ўстаноўленай даты выплаты пенсіі, што і выклікала негатыўную рэакцыю. Разам з тым тэрміны выплаты пенсіі не парушаны, растлумачылі ў ведамстве.

— Звяртаем увагу, што рашэнне аб змене тэрмінаў выплаты пенсій не прымалася. Пенсіі выплачваюцца і будуць выплачвацца своечасова, не пазней за дату выплаты пенсіі, устаноўленую канкрэтнаму пенсіянеру. Інфармацыю пра ўстаноўленую дату выплаты пенсіі можна ўдакладніць ва ўпраўленні сацыяльнай абароны па месцы жыхарства.

Алена КРАВЕЦ.

Наша пазіцыя

«Ад беларускай дзяржавы ніколі не сыходзіла і не будзе сыходзіць якога-небудзь роду пагроза»

Учора завяршыўся двухдзённы працоўны візіт міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Макея ў Швейцарскую Канфедэрацыю для ўдзелу ў 69-й сесіі Еўрапейскай эканамічнай камісіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

На сустрэчы з генеральным дырэктарам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрасам Адханомам Гебрэсусам адзначаны доўгатэрміновы і праграмны характар супрацоўніцтва Беларусі і СААЗ па шырокім спектры напрамкаў, паведамляе прэс-служба МЗС. Уладзімір Макей падзякаваў за падтрымку, што аказваецца СААЗ краіне ў сувязі з пандэміяй, адзначыўшы мэтавыя пастаўкі ў Беларусь сродкаў індывідуальнай аховы, тэст-сістэм і іншага медыцынскага інвентару. Суразмоўца са свайго боку пацвердзіў гатоўнасць арганізацыі працягнуць аказанне Беларусі тэхнічнай і кансультацыйнай дапамогі ў барацьбе з COVID-19, у тым ліку ў працэсе наладжвання вытворчасці вакцын.

Адбылася таксама сустрэча міністра з Вярхоўным камісарам ААН па правах чалавека Мішэль Бачэлет. «Міністр падкрэсліў стратэгічную прыхільнасць Беларусі асноўным прынцыпам міжнароднага права, замацаваным у Статуце ААН, і міжнародным дамоўленасцям дзяржавы ў сферы правоў чалавека», — адзначыла прэс-служба МЗС.

Уладзімір Макей таксама інфармаваў Мішэль Бачэлет аб нацыянальным кантэксце пошуку агульнадзяржаўнага балансу інтарэсаў у сферах нацыянальнай бяспекі, устойлівага развіцця і правоў чалавека. Вярхоўны камісар была азнаёмлена з ацэнкамі сітуацыі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і перспектыўнымі планамі кіраўніцтва краіны па ўдасканаленні палітычнай сістэмы шляхам канстытуцыйнай рэформы.

Міністр падкрэсліў, што Беларусь ніколі не пагодзіцца на ўмяшанне ў свае ўнутраныя справы з боку трэціх дзяржаў або міжнародных структур.

Завяршыўся першы дзень работы міністра замежных спраў Беларусі ў Жэневе сустрэчай з прэзідэнтам Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа (МКЧК) Петэрам Маўрэрам.

Учора міністр замежных спраў Беларусі выступіў у сегменце высокага ўзроўню 69-й сесіі Еўрапейскай эканамічнай камісіі (ЕЭК) ААН, а таксама сустрэўся з генеральным дырэктарам Сусветнай гандлёвай арганізацыі Нгозі Аконджа-Івеалай, падчас якой Уладзімір Макей пацвердзіў цвёрды намер Беларусі працягнуць работу па завяршэнні перамоў па далучэнні да СГА.

Аляксей Талай устанавіў новы сусветны рэкорд

Член нацыянальнай каманды па параалімпійскім спорце Аляксей Талай на этапе Сусветнай серыі IPC па плаванні ў камуне Ліньяна-Саб'ядора (Італія) устанавіў новы сусветны рэкорд. Параалімпіец, які выступае ў самым складаным класе SB1, пераадолеў 50 метраў брасам з вынікам 1:18:42.

Фота БелТА.

З паспяховым выступленнем Аляксея павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Твае перамогі, нязломная сіла волі, бяспрыкладнае імкненне да стваральнай працы дапамагаюць многім тысячам беларусаў пераадолець цяжкасці на шляху да сваёй мары, служаць арыенцірам у пошуку правільнай жыццёвай пазіцыі», — сказана ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы пажадаў спартсмену і яго сям'і дабрабыту, моцнага здароўя і поспехаў.

Цяпер Аляксей Талай рыхтуецца да выступлення на Параалімпійскіх гульнях у Токіа, куды атрымаў персанальнае запрашэнне. Спартыўную кар'еру ён сумяшчае з работай у Канстытуцыйнай камісіі і актыўнай грамадскай дзейнасцю. У 2020 годзе Аляксей Талай атрымаў спецыяльную прэмію «Беларускі спартыўны Алімп».

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сі Цзіньпін заклікаў да пабудовы сусветнай эканомікі адкрытага тыпу

Пра гэта старшыня КНР заявіў, выступаючы з праграмнай прамовай на цырымоніі адкрыцця штогадовай нарады Баоскага азіяцкага форуму. «Нам неабходна прасоўваць лібералізацыю і спрашчэнне працэдур гандлю і інвестыцый, паглыбляць рэгіянальную эканамічную інтэграцыю і ўмацоўваць ланцужкі паставак, вытворчасці, даных і чалавечых рэсурсаў», — адзначыў Сі Цзіньпін. Паводле яго слоў, адкрытасць — неабходны крок для развіцця і прагрэсу, яна таксама з'яўляецца ключом да аднаўлення эканомікі ў эпоху пасля пандэміі. «Пандэмія COVID-19 дазволіла народам розных краін свету больш ясна ўсвядоміць неабходнасць адмовы ад менталітэту халоднай вайны і гульні з нулявой сумай і супрацьстаяць новай халоднай вайне і ідэалагічнай канфрантацыі ў любых формах», — лічыць Сі Цзіньпін.

Часовы ваенны савет на чале з сынам загінулага прэзідэнта ўзначаліў Чад

Вярхоўная ўлада ў Чадзе перайшла да ваеннага савета, які ўзначаліў адзін з сыноў загінулага прэзідэнта — Махамат Кака. Пра гэта паведаміла Agence France-Presse са спасылкай на заяву армейскага камандавання Чада. «Ваенны савет будзе ажыццяўляць кіраўніцтва краінай у найбліжэйшыя 18 месяцаў», — абвясціў прадстаўнік арміі палкоўнік Азема Бермандоа. Прэзідэнт Чада з 1990 года, карпусны генерал Ідрыс Дэбі Ітна памёр учора ад раненняў. Кіраўнік дзяржавы атрымаў смяротнае раненне падчас баявых дзеянняў у мінулыя выхадныя дні, калі асабіста кіраваў аперацыяй па знішчэнні атрадаў паўстанцаў на поўнач ад сталіцы краіны — Нджамены. Раней у гэты ж дзень выбаркам Чада абвясціў, што 68-гадовы Дэбі Ітна перамог на праведзеных у краіне 11 красавіка прэзідэнцкіх выбарах, пераабраўшыся на шосты тэрмін. Ён атрымаў 79,32 працэнта ад агульнай колькасці тых, хто прагаласаваў.

У Еўропе створана новая футбольная Суперліга

Суперліга на першым этапе аб'яднала 12 зорных камандаў. Заснавальнікамі сталі шэсць клубаў з Англіі («Манчэстэр Юнайтэд», «Арсенал», «Чэлсі», «Тотэнхэм», «Манчэстэр Сіці», «Ліверпуль») і па тры з Іспаніі («Рэал Мадрыд», «Барселона», «Атлетыка») і Італіі («Інтэр», «Мілан», «Ювентус»). Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Матчы новае футбольнае аб'яднанне плануе праводзіць у сярэдзіне тыдня, каб удзельнікі маглі выступаць і ў сваіх нацыянальных чэмпіянатах. Сезон будзе пачынацца ў жніўні, у ім будуць удзельнічаць 20 камандаў, разбітых на дзве групы. Узначаліць Суперлігу прэзідэнт «Рэала» Флярэнціна Перэс. «Мы дапаможам футболу на ўсіх узроўнях, — паабяцаў ён, — дапаможам яму заняць належнае месца ў свеце. Футбол — адзіны від спорту на планеце, які мае больш за 4 мільярды балельшчыкаў. Вялікія клубы абавязаны выконваць іх жаданні». Віцэ-прэзідэнтам Суперлігі абраны прэзідэнт «Ювентуса» Андрэа Аньелі, які пакінуў пасаду старшыні Еўрапейскай клубнай асацыяцыі (ECA).

Крыптавалюта для «чайнікаў»

Што такое bitcoin і з чым яго «ядуць»?

— З'яўленне крыптавалют выклікае ў простых людзей некаторае здзіўленне і збянтэжанасць: як можна разлічвацца тым, чаго няма? На гэтую тэму з'явіліся анекдоты, такая сістэма разліку прывядзіць да недаверу. Аднак ужо летась, калі імклівы рост гэтых валют перасягнуў усе чаканні, уяўленне аб іх значнасці стала рэзка мяняцца. Многія задумаліся аб набыцці «біткоў», але страх невядомасці па-ранейшаму стрымлівае ад куплі. Раскладзіце «на пальцах», што гэта такое?

— Перш чым казаць пра крыптавалюту, разгледзім спачатку больш шырокае паняцце — «лічбавая валюта». Пад ім маюцца на ўвазе любыя грашовыя адзінкі, якія існуюць у электронным выглядзе. Выпускаць іх можа як дзяржаўны банк, так і асобная арганізацыя.

Уся лічбавая валюта падзяляецца на рэгуляваную і віртуальную (нерэгуляваную). Да першай адносяцца рэгулюемыя дзяржавай грошы, напрыклад тэставаны цяпер у Кітаі лічбавы юань. А вось за другой катэгорыяй няма кантролю з боку банка або ўрада. Сюды адносяцца гульнявая валюта, крыптавалюта і балы лаяльнасці.

«Важна памятаць, што страта доступу да кашалька азначае страту сродкаў на ім. Таму проста неабходна рабіць рэзервовыя копіі ключоў. Інакш можна страціць грошы назаўжды».

Само паняцце «крыптавалюта» расшыфроўваецца як грошы і сродкі плацяжоў у сетцы Інтэрнэт. Калі растлумачыць простай мовай, то гэта электронныя грошы, якія існуюць у віртуальным выглядзе. Іх нельга памацаць. Яны нікому не належаць. У іх няма органа адміністравання. Пры гэтым любую крыптавалюту можна абмяняць на рэальныя грошы з дапамогай спецыяльных абменных сэрвісаў.

— Атрымліваецца, гэта такія віртуальныя грошы, якія можна выкарыстоўваць як уздумаецца?

— Дагэтуль ідуць спрэчкі з дадзенай нагоды, і няма адназначнага адказу. Бо за грашыма ў іх традыцыйным разуменні нешта стаіць. Іх каштоўнасць вызначана загадзя. З крыптавалютай усё па-іншаму: яе каштоўнасць вызначаецца попытам. Калі попыт ёсць, такая валюта даражэе, калі не — таннее.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Некаторыя краіны, як Германія і Японія, прызнаюць крыптавалюту ў якасці плацежнага інструмента, але не лічаць грашыма. Іншыя дзяржавы дазваляюць выплачваць заработную плату біткоінамі. Карэя з мінулага года ўзаконіла крыптагрошы і дазволіла здзяйсняць з імі аперацыі. Таму адзінага меркавання аб статусе крыптавалют пакуль не існуе.

Што ж датычыцца Беларусі, то зусім нядаўна быў прадстаўлены першы легальны сэрвіс па абмене крыптавалют whitebird.io. Мы ўдзельнічалі ў стварэнні гэтага праекта. Найперш ён прызначаны для звычайных карыстальнікаў, якія жадаюць набыць крыптавалюту, і легальнасць гэтага сэрвісу

дае пэўныя гарантыі. Сёння ён разлічаны на грамадзян Расіі і Беларусі, але ў будучыні карыстацца згаданым сэрвісам змогуць краіны СНД, Украіна і Грузія.

На дадзены момант тут можна правесці фінансавыя аперацыі толькі з біткоінамі, але распрацоўшчыкі абяцаюць, што ў хуткім часе будуць уведзены і іншыя віды крыптавалюты. Спачатку карыстальніку неабходна зарэгістравацца ў сістэме. Са зразумелым інтэрфейсам сэрвісу гэта зойме да паўгадзіны. Дадзеная працэдура праводзіцца адзін раз. А далей вы заходзіце ў сістэму пад сваім лагінам і паролем. Купля ці продаж крыптавалюты доўжыцца некалькі хвілін. «Біткі» залічваюцца на ваш асабісты кашалёк, а грашовая сума — на банкаўскую картку Visa.

Віды і асаблівасці такіх грошай

— Колькі відаў крыптавалюты існуе?

— На сёння вядома больш за пяць з паловай тысяч відаў крыптавалют. Вядома, запомніць усе іх назвы проста немагчыма. Ды і не трэба. Многія з іх так і застануцца невядомымі, хутка скончыўшы свой кароткі тэрмін жыцця. З самых вядомых адзначу «Біткоін», «Лайткоін», «Дэш», «Эфірыум», «Рыпл» і ZCash.

— Дзе можна адсочваць інфармацыю аб крыптавалюце?

— Існуе тэхналогія «блакчэйн», у якой знаходзіцца база даных крыптавалют у выглядзе ланцужкоў блокаў. Тут можа паглядзець інфармацыю не толькі ўладальнік віртуальных грошай, але і любы ахвотны. Пры гэтым у кожным блоку змяшчаецца інфармацыя аб папярэдніх аперацыях, камісіях, пераводах. Абнаўляецца яна з пэўнай перыядычнасцю для кожнага віду крыптавалют, напрыклад, у «Біткоіна» — праз 10 хвілін, у «Эфірыума» — 15 секунд, у «Лайткоіна» — 2,5 хвіліны.

Новыя блокі ствараюць майнеры. Ад іх работы залежыць існаванне валют і абарона ад узломаў. Сама работа называецца «майнінг». У якасці аплаты майнеры атрымліваюць камісіі за праведзеныя транзакцыі.

— Атрымліваецца, што кожная крыптавалюта мае свой блакчэйн?

— Правільна іх падзяляць на дзве групы: са сваім блакчэйнам і блакчэйнам, які ствараецца іншымі. Першая катэгорыя («Біткоін», «Лайткоін», XRP, EOS і іншыя) мае свае адзінкі — манеты, другая (UNI, WBTC, AAVE і астатнія) — токены. У любым выпадку яны адносяцца да разраду крыптавалют, якія маюць свае гарантыі бяспекі і папулярнасць на біржах, уключаючы беларускі FREE2EX.

— Столькі назваў і тэрмінаў... Ці не прасцей усё назваць адным словам, каб не блытацца?

— Можна. Але толькі ў штодзённым жыцці. У крыптасуполцы эксперт-насць іграе вялікую ролю. Правільнае ўжыванне тэрмінаў падтрымлівае рэпутацыю дасведчанага чалавека, з якім можна супрацоўнічаць. Таму лепш загадзя паглыбіцца ў сутнасць працэсу і падрабязна вывучыць інфармацыю. Да таго ж цяпер яна маецца ў свабодным доступе ў сетцы Інтэрнэт.

Дзе і як можна захоўваць віртуальныя сродкі?

— Сёння існуюць спецыяльныя анлайн-кашалькі ў выглядзе дадаткаў (праграм) для камп'ютараў і тэлефонаў. Прычым для кожнай манеты ён свой. Але існуюць некаторыя мультывалютныя анлайн-крыптакашалькі (COINPAYMENTS, COINBASE, MATBEA), якія могуць падтрымліваць некалькі крыптавалют адначасова. Апошняя праграма — «Матбі» — з'яўляецца найбольш папулярнай. Яна падтрымлівае «Лайткоін», «Біткоін», «Дэш» і ZCash. Тут можна не толькі захоўваць манеты, але і выконваць абмен адной крыптавалюты на іншую, прадаваць і купляць іх.

Адзначу, што для ўсіх кашалькоў распрацавана сістэма бяспекі. Таму манеты знаходзяцца пад надзейнай абаронай, выключаюцца ўзломы і крадзяжы. Адрас кожнага кашалька ўнікальны і ніколі не паўтараецца.

Яшчэ адзін са спосабаў захоўвання — «халодны кашалёк». Ён уяўляе сабой прыладу, якая вонкава нагадвае флэшку, што далучаецца да камп'ютара, але не мае доступу да інтэрнэту. Таму такі кашалёк лічыцца самым бяспечным. Кошт такой прылады складае больш за сто долараў.

— Як даведацца адрас свайго крыптакашалька? Або яго можна прыдумаць самастойна?

— Кожная крыптавалюта мае свой афіцыйны сайт. Там жа маецца інфармацыя пра крыптакашалькі і праграмы для запампоўкі і ўстаноўкі. Яна ж прысвойвае індывідуальны адрас. Важна памятаць, што страта доступу да кашалька азначае страту сродкаў на ім. Таму проста неабходна рабіць рэзервовыя копіі ключоў. Інакш можна страціць грошы назаўжды. Добра, калі гэта нязначная сума, а калі гэта ўвесь сямейны бюджэт? Тады застаецца вінаваціць толькі сябе.

«Існуе міні-банк такіх грошай — «халодны кашалёк». Ён уяўляе сабой прыладу, якая вонкава нагадвае флэшку, што далучаецца да камп'ютара і не мае доступу да інтэрнэту».

Варта быць уважлівымі і пры пераводзе сродкаў. Запаўненне адрасоў уплывае на далейшыя дзеянні. Нават адна памылка прывядзе да незваротных наступстваў: сродкі спішуцца не туды, а вярнуць іх назад будзе немагчыма.

Апошнія гады даказалі, што крыптавалюта можа стаць адным са спосабаў заробку, які хутка развіваецца. На такім росце апошніх гадоў шматлікія кампаніі і трэйдары змаглі зарабіць вялікія грошы. Па прагнозах многіх экспертаў, гэты павышаны трэнд не планаваў зніжацца. Таму, калі паглыбіцца ў сутнасць «загадкавых» крыптавалют, ёсць усе шанцы назапасіць цэлае багацце за невялікі тэрмін. Галоўнае — не ўпусціць магчымасць.

— Дзякуй за размову.

Сяргей КУРКАЧ.

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация
«ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»

220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, 13-й этаж
тел. +375 (17) 359 74 88
inbox.nkfo@incass-expert.by, www.incass-expert.by

**Консолидированная отчетность
о деятельности банковского холдинга, в состав которого входит закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»,
опубликована на веб-сайте www.bps-sberbank.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 01 апреля 2021 года**

в тыс. бел. руб.

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	85 454	93 148
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	
4	Средства в Национальном банке	1103	140	13 871
5	Средства в банках	1104	39	249
6	Ценные бумаги	1105	-	-
7	Кредиты клиентам	1106	1	-
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	5 643	5 339
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	4 977	4 971
15	ИТОГО активы	11	96 254	117 578
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	80 919	102 478
19	Средства клиентов	1203	422	964
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	2 759	2 311
24	ВСЕГО обязательства	120	84 100	105 753
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	3 711	3 711
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	538	405
29	Фонд переоценки статей баланса	1214	-	-
30	Накопленная прибыль	1215	7 905	7 709
31	ВСЕГО собственный капитал	121	12 154	11 825
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	96 254	117 578

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за три месяца,
закончившихся 31 марта 2021 года**

в тыс. бел. руб.

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2021	01.04.2020
1	2		3	4
1	Процентные доходы	2011	56	158
2	Процентные расходы	2012	137	145
3	Чистые процентные доходы	201	(81)	13
4	Комиссионные доходы	2021	2 286	2 323
5	Комиссионные расходы	2022	754	554
6	Чистые комиссионные доходы	202	1 532	1 769
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(1)	(26)
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	-	(14)
12	Прочие доходы	208	7 745	8 443
13	Операционные расходы	209	8 473	8 394
14	Прочие расходы	210	117	75
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	605	1 744
16	Расход по налогу на прибыль	212	277	542
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	328	1 202
18	Сведения о прибыли на одну акцию в рублях			
19	Базовая прибыль на простую акцию			
20	Разводненная прибыль на простую акцию			

Председатель Правления Э.Г. Гонтарь

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания 02.04.2021

Извещение о проведении открытого аукциона

Предмет торгов	Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	Размер задатка, руб.
Лот №1 – Грузовой специальный автокран ZIL-133, год выпуска 1986 г., регистрационный знак АС5998	7 800,00	390,00

Продавец: ОАО «Стройгаз, г. Брест», 224032 г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К, тел./ф. 8(0162) 34-04-66. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/сч для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в течение 5 дней с даты заключения договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 25 мая 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений - 24 мая 2021 г. до 17.00

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
100 гадоў
21 КРАСАВІКА 2021 г.
СЕРАДА
№ 8 (15907)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Пераемнасць пакаленняў

АД СТАГОДДЗЯ ДА СТАГОДДЗЯ

«Чырвонка. Чырвоная змена» святкуе свой стагадовы юбілей

21 красавіка 1921 года ўбачыў свет першы нумар газеты «Чырвоная змена» («Красная смена»). З той падзеі мінула сто гадоў. Якой сёння павінна быць маладзёжная газета? Пра што і як размаўляць з моладдзю? Хто яны, маладыя героі нашага часу? Ці могуць майстры пяра канкурыраваць з інтэрнэт-прасторай? Што можа даць будучаму журналісту практыка менавіта ў маладзёжным выданні? Адказы на гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі круглага стала, які прайшоў напярэдадні свята ў цёплай сяброўскай атмасферы ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Новая медыярэальнасць

— Я лічу, што спалучэнне мудрасці «Звязды» і маладосці «Чырвонкі» дазваляе і маладым быць у курсе ўсіх падзей, што адбываюцца ў нашай краіне, і людзям больш сталага веку даведвацца, што цікавіць сучасную моладзь, — падзялілася сваім меркаваннем **Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.** — Тым больш што моладзь з цягам часу становіцца дарослай і пераходзіць з унутраных старонак газеты на першыя, дзе прадстаўлена ўжо больш сур'ёзная інфармацыя. Наяўнасць у Беларусі якаснага і разам з тым здольнага зацікавіць маладых чытачоў выдання — жыццёва неабходная. Трэба разам з моладдзю фарміраваць парадак дня, ісці за ёй у інтэрнэт-прастору, пашыраючы сваю аўдыторыю і сферу ўплыву, і нацэльваць маладых на стваральную працу. Так, сёння ўсім друкаваным СМІ даводзіцца канкурыраваць з сацыяльнымі сеткамі, але апошнія не разлічаны на глыбіню, гэта проста больш зручная і кампактная форма перадачы інфармацыі. А ў газеце — важкае друкаванае слова, якому ўсе давяраюць.

Сёння многія сутыкнуліся з тым, што трэба весці дыялог у інтэрнэт-прасторы, а там патрабуюцца нейкія іншыя падыходы, бо дзейнічаюць свае каноны і правілы. У маладых свая медыярэальнасць, а «Чырвонка», я упэўнена, павінна прыўнесці ў інтэрнэт-прастору дабрыню і маральныя каштоўнасці. Спалучыць высокія рэйтынгі і духоўнасць вельмі складана, але магчыма. Важна і тое, што мова, на якой «Чырвонка» размаўляе са сваімі чытачамі, — матчына мова. У газеце набіраюцца вопыту маладыя журналісты, выкрышталізоўваюцца будучыя майстры пяра...

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Спецхран народнай памяці

«ЧЫРВОНКА» КЛІЧА ДА ПЕРАМОГІ!

Сёння ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрыецца выстаўка, прымеркаваная да 100-годдзя «Чырвонай змены», дзе можна будзе даведацца пра тое, праз якія выпрабаванні прайшла газета ў ваенныя гады, у якіх складаных умовах даводзілася працаваць журналістам і якую ролю яна адыграла ў той час. Газета заклікала на змаганне з ворагам, паведамляла пра падзеі на франтах і аперацыі партызан. Яе артыкулы натхнялі беларусаў на подзвігі, а з вёсак, куды трапляла «Чырвонка», моладзь масава ішла ў партызанскія атрады. У камсамольскіх арганізацыях вылучаліся людзі, якія сярод народных мсціўцаў і насельніцтва вялі агітацыйную работу, ладзілі калектыўную чытку артыкулаў з газет. Інфармацыя пра падпольную друкарню трымалася ў найвялікшым сакрэце. Першы час нават партызаны лічылі, што «Звязда» і «Чырвоная змена» дасылаюцца з Вялікай зямлі на самалёце. Сапраўды, цяжка было паверыць, што на акупаванай тэрыторыі могуць выходзіць рэспубліканскія газеты. Адзін гэты факт пацвярджаў, што з ворагам можна змагацца, дадаваў упэўненасці, што Беларусь будзе свабоднай. Гэта разумелі і захопнікі: не раз яны засылалі шпіёнаў з заданнем знішчыць рэдакцыю, скідвалі бомбы на вёскі, дзе па іх разліках маглі знаходзіцца падпольныя друкарні, адпраўлялі самалёты-разведчыкі на тэрыторыю, абжытую партызанамі...

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Паяднаныя агульнай гісторыяй

Ваявалі і зброяй, і мастацкім словам

У гады вайны «Чырвоная змена» і «Звязда», як прынята лічыць, выдаваліся на легендарным востраве Зыслаў. Насамрэч, такіх месцаў было шмат. Адно з іх — вёска Дварэц Любанскага раёна.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Народныя мсціўцы тады змагаліся не толькі зброяй, але і мастацкім словам. «Чырвоная змена» стала сімвалам аднайменнага калгаса, якім кіраваў Герой Сацыялістычнай Працы Кузьма Шаплыка. Супрацоўнікі газеты любілі прыязджаць на Любаншчыну, пісаць пра моладзь, хлебаробаў, работнікаў мясцовага рыбгаса, масласырзавода, камбіната будаўнічых матэрыялаў, настаўнікаў, паэтаў, пісьменнікаў. Газета заўсёды яскрава адлюстроўвала гераічныя і працоўныя, творчыя і літаратурныя падзеі, якія адбываліся ў раёне. З «Чырвонай зменай» і «Звяздой» мы творча супрацоўнічаем і цяпер, неаднаразова ладзілі вандроўкі на востраў Зыслаў, у вёску Дварэц, па памятных мясцінах Любаншчыны, — распавёў **супрацоўнік дзіцячай мастацкай школы Васіль КАТКАВЕЦ.**

Гісторыя Любаншчыны сапраўды багатая і слаўная. Двое землякоў былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, столькі ж сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеняў. За мужнасць, праяўленую моладдзю ў гады ліхалецця, Любанская раённая камсамольская арганізацыя ў 1968 годзе была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Не менш дасягненняў і ў працоўнай дзейнасці. У 1948 годзе краіна ўшаноўвала першага ў БССР Героя Сацыялістычнай Працы — брыгадзіра саўгаса «Х гадоў БССР» Паўла Калыску. Усяго ж у Любанскім раёне 18 працаўнікоў сельскай гаспадаркі атрымалі гэта ганаровае званне.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА гадоў Чырвоная змена
21 04 2021 г.

АД СТАГОДДЗЯ ДА СТАГОДДЗЯ

Творчая пляцоўка

— Дачыненне да «Чырвонай змены» мела цэлае пакаленне выбітных журналістаў, — падкрэслівае **дэкан факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Вольга САМУСЕВІЧ.** — Гэта выданне ўжо ўвайшло ў гісторыю беларускай журналістыкі. Я сваю кандыдацкую дысертацыю таксама прысвяціла «Чырвонай змене», даследавала, як газета ўплывае на розумы маладых. Самае галоўнае, што з яе старонак гучыць беларускае слова, якое кранае сэрца і душу. На жаль, маладое пакаленне ўсё менш ведае родную мову. Гэта востра адчуваецца падчас прыёмнай кампаніі на журфаку, калі абітурыенты могуць выбіраць, на якой мове будуць пісаць творчае сачыненне. І з кожным годам колькасць тых, хто выбірае беларускую, каб паказаць свае творчыя здольнасці, змяншаецца. А я ўпэўнена, што толькі родная мова дазваляе казаць не штампамі. У пацвярджэнне хачу дадаць, што творчыя сачыненні, напісаныя абітурыентамі па-беларуску, як правіла, атрымліваюць больш высокія балы, таму што, калі чалавек ведае мову і піша ад сэрца і душы, гэта не пакідае раўнадушнымі і экзаменатараў.

Сапраўдным піяршчыкам «Чырвонай змены» на журфаку заўсёды быў Уладзімір Касько, адзін з яе былых рэдактараў. Мы і сёння пастаянна звяртаемся да «Чырвонкі» і на занятках па гісторыі журналістыкі, і падчас вывучэння прафесійных дысцыплін, таму што ў яе журналістаў ёсць чаму павучыцца. Упэўнена, што без Выдавецкага дома «Звязда», дзе ўсе выданні арыентаваны на беларускую мову, мы не падрыхтуем добрыя кадры.

«Сёння ўсім друкаваным СМІ даводзіцца канкураваць з сацыяльнымі сеткамі, але апошнія не разлічаны на глыбіню, гэта проста больш зручная і кампактная форма перадачы інфармацыі».

Але, на маю думку, трэба часцей даваць слова самой моладзі. Калі да вас прыходзяць на практыку журналісты-пачаткоўцы, рабіце ім, калі ласка, зніжку: няхай іх слова гучыць пакуль не так па-майстэрску, як у вопытных журналістаў, але з маладымі павінны размаўляць такія ж маладыя, якія знаходзяцца з імі на адной хвалі. Чытача не падманеш — ён адчуе, што з ім размаўляе свой чалавек. Няхай у маладога журналіста артыкул атрымаўся не такі дасканалы, але надрукуйце яго, каб той адчуў сябе патрэбным.

— У моладзі ёсць тры лозунгі: «Стыльна!», «Модна!», «Маладзёжна!» Вось гэтых прынцыпаў павінна прытрымлівацца і маладзёжнае выданне, — разважае **другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.** — Я падтрымліваю дэкана журфака: трэба даваць старонкі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

газеты моладзі, якая робіць толькі першыя крокі ў журналістыцы. Для іх будзе вельмі прэстыжным надрукавацца ў рэспубліканскім выданні. Чаму газеце давяраюць? Таму што тут кожнае слова вывераное, унізе стаіць прозвішча аўтара, які за кожную літару нясе адказнасць. А ў інтэрнэце пануе ўсёдазволенасць, там праблематычна шукаць сур'ёзную аналітыку і разлічваць на дакладнасць...

Пра смеласць і няшчырасць

— Калі б я ведаў «рэцэпт» маладзёжнага выдання, якое «выстраліць», я ім з вамі абавязкова падзяліўся б, — усміхаецца **галоўны рэдактар газеты «Знамя юности» Мікалай МАЧЭКІН.** — Ствараць маладзёжную газету заўсёды было цяжэй, чым любое іншае выданне, таму што яе аўдыторыя — разнашэрсная, вельмі капрызлівая, інтарэсы ў нашых патэнцыяльных чытачоў розныя. Як дагадзіць усім? Тым больш што зараз ёсць мноства інтэрнэт-пляцовак, сацсеткі, тэлеграм-каналы, але нашы матэрыялы не павінны станавіцца падобнымі на пасты «УКантакце». Дзе, як не ў газеце, мы можам атрымаць задавальненне ад прыгожай літаратурнай мовы? І калі я чую, што друкаваныя выданні дажываюць апошнія дні, то заўсёды кажу: «Не хвалюйцеся, мы яшчэ напішам аб закрыцці апошняга сайта». Мне хочацца верыць, што менавіта так і будзе. Задача маладзёжных СМІ — не гнацца за хуткасцю падачы інфармацыі. Мы не агрэгат навін. Няважна, калі ты прачытаеш гэту навіну: на хвіліну раней ці пазней. Сапраўдная журналістыка — гэта зусім не пра хуткасць, а ў першую чаргу пра якасць.

У маладзёжных выданнях заўсёды пануе асаблівая атмасфера, сярод калег няма ніякай зайздрасці. Таму «Чырвоная змена» і «Знамя юности» — найлепшая школа для пачынаючых журналістаў: тут вас навучаць пісаць, збіраць і аналізаваць інфармацыю. Прыгадваю, як я сам прыйшоў у «Знамя юности» дзесяць гадоў таму. Мяне вельмі добра прынялі ў калектыве. Мне хацелася паказаць сябе, на што я здольны, даказаць, што магу зрабіць лепш. Я ўвогуле лічу, што сапраўдны журналіст павінен быць па-добраму нахабным, у яго павінны гарэць вочы.

Галіна Барысаўна ПШОНІК аддала «Чырвонай змене» дваццаць гадоў свайго жыцця (працавала ў выданні з 1972 да 1992 года). Сёння яна рэдактар аддзела часопіса «Народная асвета».

— Я за смеласць і ў газеце, і ў часопісе, — кажа яна. — Смеласць страхуе ад няшчырасці, а няшчырасць — самае страшнае для любога друкаванага выдання. Чытачы яе вельмі добра распазнаюць. Лічу, што забароненых тэм быць не павінна. Трэба пісаць пра ўсё, што моладзь цікавіць. Цяпер я не сутыкаюся з маладымі напрамую, але працую з людзьмі, якія застаюцца з моладдзю сам-насам штодня: гэта настаўнікі і выкладчыкі. З іх дапамогай я правяла мініі-даследаванне, і, шчыра кажучы, яго вынікі атрымаліся не зусім аптымістычныя. Нават са студэнтаў — будучых журналістаў — друкаваныя выданні чытаюць толькі адзінкі. Праўда, не чытаюць сёння не толькі газеты, але і кнігі. Іх месца занялі сацыяльныя сеткі. Педагогі пацікавіліся ў моладзі, хто, на іх думку, героі нашага часу. На першых пазіцыях у гэтым рэйтынгу аказаліся блогеры, спартсмены і спевакі.

Дык пра што ж трэба размаўляць з сучаснымі дзецьмі? Магчыма, гэта прагучыць нечакана, але іх цікавяць нявыдуманыя жыццёвыя гісторыі. Адна настаўніца расказала, што запрашала на сустрэчу да сваіх вучняў спачатку рэпера, а потым дзядулю аднаго з іх. І дзядуля зацікавіў дзяцей значна больш. Мяркую, што ва ўсіх нас стэрэатыпнае бачанне дзяцей. Мы насамрэч мала іх ведаем. У новага пакалення, як высвятляецца, захавалася патрэба ў маральных размовах. У сацыяльных сетках яны яе не задавальняюць...

«Трэба разам з моладдзю фарміраваць парадак дня, ісці за ёй у інтэрнэт-прастору, пашыраючы сваю аўдыторыю і сферу ўплыву, і нацэльваць маладых на стваральную працу».

Алена Васільеўна ЦЯРЭНЦЬЕВА працавала ў «Чырвонай змене» з 1985 да 1990 года, а сёння з'яўляецца намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Алеся».

— Вялікі дзякуй тым людзям, якія змаглі зберагчы і захаваць усё лепшае, што было ў «Чырвонцы» і дваццаць, і трыццаць, і сорак гадоў таму. Хоць сёння працаваць значна цяжэй, чым у тыя часы. Змяніўся не толькі чытач — мы ўсе сталі крышачку іншымі, — разважае Алена Васільеўна. — Увогуле, сёння ў любым выданні цяжка зразумець: а хто твой чытач і што ён ад цябе чакае? Мы гатовы зрабіць, каб яму было цікава, але хто ён? У БДУ раней была вялікая праграма «Абітурыент журфака», якая падтрымлівала маладзёжную прэсу і стымулявала таленавітых старшакласнікаў прыходзіць да нас і публікавацца. Мы заўсёды былі ў канкурэнцыі з газетай «Знамя юности», але гэта была добрая канкурэнцыя, якая дапамагала нам усім расці. І ў тыя часы, і сёння беларускамоўнаму выданню было цяжэй, таму ЦК камсамола дапамагаў нам крышачку больш. Калі «Чырвоная змена» адзначала сваё 65-годдзе, разам з вучонымі з Акадэміі навук была арганізавана экспедыцыя на Палессе. Мы даследавалі вялікую праблему — пыльныя буры пасля яго асушэння. Потым нават выдалі брашуру. Такія акцыі, безумоўна, прыцягвалі да газеты ўвагу.

Лічу нармальным, што пачынаючыя журналісты прыходзяць у маладзёжнае выданне, набіраюцца вопыту і ідуць далей, хоць, вядома, заўсёды балюча з імі расставацца. Ім трэба быць удзячнымі газеце, якая пасадзейнічала таму, што яны ў дасканаласці авалодалі словам, сталі больш моцнымі ў выбары тэматыкі. А нам заўсёды радасна назіраць потым за іх поспехамі...

Размаўляць на адной мове

Дар'я ШЛАПАКОВА, спецыяльны карэспандэнт «Звязды» і пастаянны аўтар «Чырвонкі», прыйшла ў Выдавецкі дом «Звязда» яшчэ студэнткай-практыканткай і першыя крокі ў прафесіі рабіла менавіта ў маладзёжным дадатку. Як малады спецыяліст працуе ў газеце ўжо амаль два гады. Прызнаецца, што выдатна разумее розніцу паміж тым, што яна пісала і думала пра свае матэрыялы раней і што думае сёння.

— Моладзі цікава чытаць пра такіх жа ўнікальных людзей, як яны самі, бо ўсе маладыя лічаць сябе ўнікальнымі, — разважае Дар'я. — Як вы думаеце, чаму блогеры цікавяць і натхняюць маладых? Таму што яны вельмі блізка да сябе падпускаюць і расказваюць абсалютна ўсё пра сваё жыццё. І тым, хто іх чытае, падаецца, што з імі размаўляе родны ім чалавек, іх сябар. Таму трэба рухацца ў бок шчырых артыкулаў, магчыма, не вельмі «прычасаных», але з унікальным аўтарскім стылем. Каб наш чытач таксама адчуваў сябе сябрам з аўтарам. Камусьці падабаецца вышываць, а камусьці — танцаваць, камусьці цікава чытаць пра фільмы, а камусьці — пра спорт, таму арыентавацца трэба на ўсіх, у кожнага артыкула знойдзецца свой чытач. Сучаснай моладзі хочацца даведвацца пра тое, што іх хвалюе і кранае душу: пра адносіны з бацькамі і адносіны паміж сабой, яны клапоцяцца пра экалогію і гендарную роўнасць.

«Мы і сёння пастаянна звяртаемся да «Чырвонкі» і на занятках па гісторыі журналістыкі, і падчас вывучэння прафесійных дысцыплін, таму што ў яе журналістаў ёсць чаму павучыцца».

А сацыяльныя сеткі вельмі дапамагаюць мне ў рабоце, бо там можна знайсці любога героя для матэрыялу з любым хобі, людзей з рознымі, нават вельмі рэдкімі, прафесіямі, рознымі меркаваннямі па шматлікіх пытаннях. Заводзіць размову і камунікаваць у сацыяльных сетках таксама значна прасцей, бо там многія адчуваюць сябе ў сваёй стыхіі.

Хачу таксама дадаць: маім героям падабаецца, што будзе папяровы варыянт артыкула, а не толькі электронны. Яны рады прачытаць пра сябе на беларускай мове. Кажуць: «Беларуская мова — гэта вельмі крута!» Хоць не ўсе гавораць на ёй, але чытаць на роднай мове пра сябе ўсім падабаецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Акордамі душы

АДДАНАЯ РОДНАМУ СЛОВУ,

ці Шчасце быць беларускай

Адна з праблем сучаснай нацыянальнай культуры — недастаткова актыўнае ўжыванне беларускай мовы. Пра гэта гаворыць і Міжнародная арганізацыя ЮНЕСКА, якая ўнесла беларускую ў атлас пад назвай «Мовы свету ў небяспецы». І калі старэйшае пакаленне хоць бы паміж сабой гаворыць па-беларуску або на трасянцы, то моладзь выкарыстоўвае ў штодзённым жыцці пераважна рускую.

Ірына Галавач з аўтарам.

Аднак ёсць і іншыя прыклады. Мы пазнаёміліся з дзяўчынай, якая любіць родную мову і размаўляе толькі на ёй. Ірына Галавач — вучаніца 11 класа Мазырскага дзяржаўнага абласнога ліцэя. Дзяўчына «ідзе» на залаты медаль, бярэ ўдзел і перамагае ў алімпіядах па беларускай мове і літаратуры, дзякуючы чаму ўжо мае стабільны сертыфікат па цэнтралізаваным тэсціраванні.

— У мяне ёсць мара — паступіць у медыцынскі ўніверсітэт. Мяне заўсёды цікавілі людзі, хочацца ім дапамагаць і рабіць усё дзеля таго, каб яны былі здаровыя і шчаслівыя. Я вельмі люблю сваю малую радзіму. Нават зараз, калі на пяць дзён еду са сваёй вёскі Крукавічы з Калінкавіцкага раёна ў Мазыр на вучобу, сэрца поўніцца пачуццямі страты нечага свайго, самага роднага! Я веру ў лёс: калі ты тут нарадзіўся, табе наканавана штосьці зрабіць для сваёй Радзімы, унесці ўклад у развіццё краіны. Кожны мае права на выбар і сам выбірае, на якой мове гаварыць. Любоў да роднага краю, да роднага слова прыходзіць з часам. Я шчаслівая, што жыву ў Беларусі.

— Адкуль у цябе такая прыхільнасць да роднай мовы?

— Справа ў тым, што ў пятым класе ў мяне з'явілася новая настаўніца — Святлана Лявонаўна Рак. Я яшчэ не бачыла чалавека, больш чыстага душою, які так моцна любіць сваю справу, якога па-сапраўднаму можна назваць Настаўнікам. Калі яна гаворыць, адчуваеш усю магутнасць беларускага слова. Мы з ёй займаліся, рыхтаваліся да алімпіяд, і з кожным днём станавілася ўсё цікавей вывучаць родную мову. Любоў да беларускага слова расла. Вельмі сумна было пакідаць сваю любімую настаўніцу. Але жаданне развівацца і мара паступіць у прэстыжны ўніверсітэт узялі сваё. У ліцэі мне таксама сустрэліся добрыя настаўнікі. Валянціна Аляксандраўна Шэцка, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, дала многа ведаў, яе аптымістычны настрой заўсёды натхняў на новыя здзяйсненні, а мудрыя парады дапамагалі ў жыцці.

А вось што кажа сама Валянціна Аляксандраўна Шэцка пра сваю вучаніцу: «Мову любіць па-сапраўднаму, таму і такія вынікі. Яна сапраўдная ва ўсім. Працавітасць проста велізарная — усюды Ірына на вышыні».

— Ці не ўзнікаюць цяжкасці ў камунікацыі з аднагодкамі?

— Мне падабаецца размаўляць на беларускай мове, я яе не цураюся. У нас дзве сястры — руская мова і беларуская. Мае сябры размаўляюць на рускай, але гэта не перашкаджае нашым стасункам. Аднакласнікі заўсёды мяне падтрымліваюць. І наогул, мне на жыццёвым шляху сустракаюцца толькі добрыя людзі, ні адзін дрэнны чалавек яшчэ не трапляўся.

«Я веру ў лёс:
калі ты тут нарадзіўся,
табе наканавана
штосьці зрабіць
для сваёй Радзімы, унесці
ўклад у развіццё краіны».

— Ці чытаеш ты беларускіх аўтараў звыш школьнай праграмы?

— Канешне! Без гэтага не было б вынікаў. Маім любімым паэтам з'яўляецца Максім Багдановіч, яго творчасць своеасаблівая. А любімы празаік — Васіль Быкаў, вельмі падабаецца, як ён адлюстроўвае падзеі вайны, праймае да слёз. Ведаеце, калі літаратурны твор выклікае моцнае ўражанне, калі я плачу, то такі верш ці раман мяне захапляюць і доўга помняцца.

— Якая будучыня ў нашай мовы?

— Безумоўна, яна будзе жыць! Зараз яна як ніколі актыўна развіваецца ў банкаўскай сістэме, у галіне спорту і IT-сферы, створаны і паспяхова дзейнічаюць розныя інавацыйныя праекты. Беларуская мова жыве, на ёй гавораць моладзь і ў Гродне, і ў Мінску, і ў іншых гарадах. Як пісаў Уладзімір Дубоўка, гэта «Матчын дарунак ад самай калыскі». Колькі ездзіў на алімпіяды, назіраю імпэт юнакоў і дзяўчат у вывучэнні роднай мовы — значыць, ёсць цікавасць! Алімпіяды і конкурсы ўзмацняюць жаданне паглыбляцца ў беларускую мову. Калі вывучаеш яе, адчуваеш сувязь і адзінства з нашым добрым і працавітым народам!

Сустрэча з сапраўднай беларускай натхніла нас на правядзенне невялікага анлайн-апытання сярод мазырскіх падлеткаў, удзел у якім узялі каля 50 навучэнцаў 11-й школы горада. Па атрыманых даных, у побыце руская мова пераважае ў 94,9 працэнта апытаных, з іх 20,5 працэнта рэгулярна выкарыстоўваюць англійскую і іншыя замежныя мовы. Беларуская мова карыстаецца меншым попытам: усяго 10,3 працэнта рэспандэнтаў выкарыстоўваюць яе. У той жа час 69,2 працэнта апытаных лічаць патрэбным вывучэнне мовы ў школах. Астатнія 30,8 працэнта рэспандэнтаў, якія адказалі «не», аргументуюць сваю пазіцыю «старамоднасцю мовы». Аднак 64,1 працэнта падлеткаў лічаць, што беларускую мову неабходна больш актыўна прапагандаваць на тэлебачанні, радыё, інтэрнэт-СМІ і іншых інфармацыйных пляцоўках.

Далейшы лёс нашай мовы, упэўнены, залежыць толькі ад нас, маладых.

Аляксандр ВЕСЯЛОЎ,
вучань 9 класа СШ № 11 г. Мазыра, член клуба «Юны журналіст» Мазырскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

Часі і магчымасці

СТАЛІ НАЙЛЕПШЫМІ Ў СЕЦІВЕ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ўзнагародзіў пераможцаў інтэрнэт-прэміі IT Youth па выніках 2020 года.

Вынікі штогадовага карпаратыўнага праекта маладзёжнай арганізацыі былі падведзены напярэдадні Міжнароднага дня інтэрнэту. Яе саіскальнікамі ў 2020 годзе сталі як тэрытарыяльныя арганізацыі БРСМ, так і актывісты, якія найбольш ярка развіваюць сеткавыя рэсурсы Саюза моладзі «УКантакце», Instagram і Telegram і свае акаўнты ў сацсетках.

Пераможцаў інтэрнэт-прэміі ў некалькіх намінацыях вызначылі на конкурснай аснове. Найлепшыя групы ў сацыяльнай сетцы — у Мінскага гарадскога камітэта, Мінскага раённага камітэта, першасных арганізацый з правамі раённага камітэта БРСМ Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, а таксама пярвічкі сярэдняй школы № 4 Баранавіч, паведамілі ў Цэнтральным камітэце БРСМ.

Найлепшы акаўнт у Instagram — у Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ і першаснай арганізацыі з правамі раённага камітэта Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, у месенджары Telegram — у Маскоўскага райкама БРСМ Мінска.

Акрамя таго, вызначаны пераможца ў намінацыі «Найлепшы маладзёжны інтэрнэт-рэсурс». Гэта першасная арганізацыя з правамі раённага камітэта БРСМ Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Фота БРСМ.

«За захаванне трэндаў сацыяльных сетак» узнагароду атрымала другі сакратар Кастрычніцкага раённага камітэта маладзёжнай арганізацыі Віцебска Вікторыя Купрыянава. У намінацыі «Прарыў года ў сацыяльных сетках і анлайн-платформах» адзначаны педагог-арганізатар сярэдняй школы № 11 Светлагорска Мікіта Бераснеў. За папулярызацыю дзейнасці саюза і маладзёжнай палітыкі ў сацыяльных медыя ўзнагароджаны навучэнец сярэдняй школы № 3 Светлагорска Аляксей Пінчук.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў інтэрнэт-прэміі адбылася падчас рэспубліканскага інтэрнэт-форуму БРСМ IT Youth 2021, у якім прынялі ўдзел каля двухсот прадстаўнікоў моладзі з усіх рэгіёнаў краіны. Пераможцам уручаны фірменныя статуэткі і дыпломы.

Бачыць мэту

ЗРАБІ СЭЛФІ-АПОВЕД АБ РАБОЧЫМ МЕСЦЫ

Абласны маладзёжны працоўны інтэрнэт-праект «SelfieПРАЦА» распачаўся на Віцебшчыне. Ён будзе доўжыцца да 21 кастрычніка і запрашае да ўдзелу працуючых юнакоў і дзяўчат.

Праект праводзіцца з мэтай папулярызацыі сучасных прафесій і працоўных спецыяльнасцяў, павышэння іміджу і прэстыжу прафесій у сферы сельскай гаспадаркі праз інтэрнэт-рэсурсы, паведамілі ў Віцебскім абласным камітэце БРСМ.

Удзельнікам прапаноўваецца зрабіць сэлфі на фоне свайго працоўнага месца або запісаць кароткае сэлфі-відэа з апісаннем сваёй работы (на фоне лагатыпа прадпрыемства, падчас працы ў полі, установе адукацыі, каля станка на заводзе, каля аўтамабіля і г. д). Фота ці відэа размяшчаецца ў асабістых акаўнтах сацыяльных сетак з выкарыстаннем хэштэгаў #БРСМВО; #SelfieПРАЦА, у посце трэба напісаць кароткі каментарый з указаннем месца, дзе зроблена фота/відэа, сваёй спецыяльнасці.

Удзел у праекце азначае згоду аўтара на наступнае выкарыстанне яго работы з указаннем імя. Удзельнік павінен быць не старэйшым за 21 год. Падвядзенне вынікаў пройдзе з 21 кастрычніка да 23 лістапада. Пераможцам праекта стане той удзельнік, які набярэ найбольшую колькасць «лайкаў». Каб пазбегнуць накруткі галасоў, улічваюцца толькі «лайкі» ўдзельнікаў акаўнта ў Instagram @brsmvo.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Лакацыі актыўнасці

ДА СПАБОРНІЦТВА І ПРАЦЫ ГАТОВЫ!

Навучальны семінар «Школа падрыхтоўкі кіраўнікоў працоўных калектываў», арганізаваны Рэспубліканскім штабам студэнцкіх атрадаў БРСМ, прайшоў на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён адначасова стаў і пляцоўкай для падрыхтоўкі беларускай каманды, сфарміраванай Саюзам моладзі, для ўдзелу ў I Міжнародным будаўнічым чэмпіянаце, што праходзіць у Сочы з 20 да 23 красавіка.

Асноўны этап падрыхтоўкі зводнага будаўнічага студэнцкага атрада адбыўся на базе Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і буйных прадпрыемстваў Наваполацка.

Дарэчы, у 2020 годзе сіламі ўсіх структур Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў былі працаўладкаваны 24 044 чалавекі ў складзе 1689 студэнцкіх атрадаў. У бягучым годзе плануецца дапамагчы не менш чым 25 тысячы патэнцыяльным байцам.

З 3 сакавіка ва ўстановах адукацыі рэалізоўваецца прамапраект «Выбіраем студатрад!». За гэты час для працы ў студэнцкіх атрадах запісалася рэкордная колькасць маладых людзей — 10 тысяч чалавек. У рамках круглагадовай працоўнай занятасці сёння прыступілі да працы 24 студэнцкія атрады розных профіляў, якія аб'ядналі больш за 400 чалавек.

У трэцім працоўным семестры 2021 года Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў плануе рэалізаваць чатыры буйныя вытворчыя і міжнародныя праекты: гэта Усебеларуская маладзёжная будоўля «Горад маладосці», «Атлант–2021», «Арляня» ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Камсамольскі» на базе Усерасійскага цэнтра «Арляня» сумесна з «Расійскімі студэнцкімі атрадамі», будаўніцтва магістралі М1 (Беларусь) сумесна з «Мабільнымі кадрамі Расіі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЧЫРВОНКА» КЛІЧА ДА ПЕРАМОГІ!

Апошні жаўрук

У выніку масіраваных бамбардзіровак рэдакцыі рэспубліканскіх газет засталіся без паліграфічнай базы. Але ўжо 10 ліпеня 1941 года ЦК ЛКСМБ аднавіў выданне «Чырвонай змены». Спачатку яна выходзіла ў перасоўнай друкарні, а пасля — у Гомелі на фабрыцы «Палесдрук». Працаваць журналістам даводзілася па начах, часта пад бесперапыннымі бамбёжкамі. «Маладзёжка» друкавалася тры-чатыры разы на тыдзень. Усяго ў прыфрантавым Гомелі паспелі выйсці 24 нумары агульным накладам звыш 50 тысяч экзэмпляраў. З дапамогай сувязных газету адпраўлялі на акупаваную тэрыторыю.

Са стратай Гомеля і акупацыяй усёй тэрыторыі Беларусі рэдакцыі вымушаны былі перабрацца ў эвакуацыю. Апошні нумар «Чырвонай змены» друкаваўся ў кастрычніку 1941 года ў Тульскай вобласці, у вёсцы Жаваранкі. Нумары, упакаваныя ў цюкі, даставілі на аэрадром. Першы сакратар ЦК ЛКСМБ Міхаіл Зімянін, калі адпраўляў газеты, з сумам пажартаваў: «Ну вось, паляцеў наш апошні жаўрук»... Але замаўчала «Чырвонка» ненадоўга. Ужо ў 1942 годзе было прынята рашэнне пачаць выдаваць яе ў зоне партызанскіх злучэнняў на Любаншчыне. Сярод партызан былі сабраны журналісцкія кадры. Піліп Касцюкавец, былы рэдактар любанскай раённай газеты, тады выконваў абавязкі палітрука, Аляксандр Сакевіч быў за радыста, запісваў звесткі Саюзінфармбюро. Мікола Курыка, Ніна Цылько і Амяльян Шурпач да вайны працавалі ў капаткевіцкай раёнцы. Восенню 1942 года разам з масквічамі-аўтаматчыкамі пешшу ўдалося перабрацца ў тыл карэспандэнту «Савецкай Беларусі» Георгію Шчарбатаву. А будучага рэдактара з нецярпеннем чакалі з Масквы яшчэ з восені. Прылёт затрымліваўся з-за дрэннага надвор'я: пахмурныя дні з туманамі і густымі аблокамі, што закрывалі зямлю, змянялі частыя мяцеліцы. Напрыканцы студзеня, калі неба нарэшце стала ясным і ўначы ярка высыпалі зоркі, доўгачаканы самалёт з Масквы прывёз абсталаванне. На ім прыляцеў і Міхаіл Барашкаў, якога прызначылі рэдактарам адразу дзвюх рэспубліканскіх газет — «Звязды» і «Чырвонай змены».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Чырвоная змена
Орган ЦК і Мінскага Абкома Ленінскага Камсамола Беларусі

31 студзеня 1943 года выйшаў першы нумар «Чырвонкі-партызанкі». І адразу з перадавога артыкула газета заклікала: «Малады беларус! Радзіма кліча да помсты! Забі акупанта».

Напачатку рэдакцыя размясцілася ў маленькай вёсачцы на ўскрайку балот на поўдні Любаншчыны. Журналісты цэлымі днямі не адыходзілі ад няхітрага абсталявання. Два разы на тыдзень, у сераду і суботу, яны выдавалі «Звязду», а па нядзелях выходзіла «Чырвоная змена». Прычым кожны работнік павінен быў валодаць універсальнымі навыкамі: займацца наборнай справай, умець скласці макет, падрыхтаваць палосы да друку. Дзякуючы такой загартоўцы ў хуткім часе Аляксандр Сакевіч быў прызначаны рэдактарам асобнай падпольнай газеты. А пазней гэты вопыт будуць пераймаць рэдактары капаткевіцкай і старадарожскай падпольных раённых газет. Па дапамогу ў арганізацыі падпольнай рэдакцыі звяртаўся і Мікалай Дастанка, які ў гады вайны ўзначаліў раённую партызанскую газету «Народны мсцівец».

Нумар за ноч

На першым месцы, дзе выдаваліся «Звязда» і «Чырвоная змена», журналістам не ўдалося затрымацца надоўга. Гітлераўцы прабіраліся да Сасноўкі, дзе размяшчаўся штаб партызанскага злучэння і Мінскі падпольны абкам партыі, яны спадзяваліся знішчыць таксама і падпольную друкарню. Ворагі прайшлі ўсяго за паўкіламетра ад вёскі Шостая брыгада, дзе працавалі журналісты. Пачуўшы стральніну, работнікі падпольнай друкарні хутка пагрузілі на сані абсталяванне і выбраліся на балоты. Густы снег, што сыпаў у той час, хаваў іх сляды... Пасля некалькіх гадзін блукання паміж хмызнякамі ўцекачы паснулі пад галінамі разлапістай яліны. А пасля кароткага адпачынку раскладлі вогнішча і... вырашылі выпускаць газету. За ноч быў зроблены нумар, прымеркаваны да Міжнароднага дня жанчын.

Замёрзлыя, згаладалыя пасля вандравання па балотах, журналісты спрабавалі надрукаваць яшчэ адзін нумар. Ды толькі ад марозу не гнуліся пальцы, і працаваць з металічным наборам не атрымлівалася. Дзякуючы Піліпу Касцюкаўцу, які выдатна ведаў гэтую мясцовасць, удалося атрымаць інфармацыю, куды перабраўся падпольны абкам...

Але і другі прыстанак у вёсцы Рэпін журналістам давялося хутка пакінуць. Партызаны затрымалі шпіёнаў з планам размяшчэння падпольнага абкама і друкарні. Дзякуючы данясенню партызанскай разведкі журналісты паспелі пакінуць небяспечны прытулак. Яны ад'ехалі толькі на кіламетр, калі на вёску нямецкія самалёты пачалі скідаць бомбы...

Журналісты былі вымушаны перабрацца на балота. Адасоблены астравок, які «чырваназменаўцы» і «звяздоўцы» звалі Востравам друку, ці Блудным (бо паспрабуй яго адшукай), быў яшчэ і месцам збору ЦК камсамола. Тут абмяркоўваліся баявыя справы моладзі. Камсамольскія кіраўнікі, што былі частымі гасцямі, прыносілі з падпольнага райкама камсамола і партызанскіх атрадаў матэрыялы, даставалі паперу для выдання газет. «Напружаная работа ад цямна да цямна, адсутнасць мыла, укусы камароў хутка далі нам зусім не цывілізаваны выгляд, — успамінаў Амяльян Шурпач. — У мяне, напрыклад, парваліся боты, і я хадзіў босы. У Міколы была прапалена кашуля так, што нагадвала рэшата. Мы абраслі валасамі, бо дзе ж тая цырульня сярод балот? Дык вось, прыйшоў неяк Міхаіл Васільевіч Зімянін. Глянуў на мяне і давай адчытваць, чаму такі замурзаны, не пастрыжаны». Тады сакратар ЦК камсамола загадаў Шурпачу пастрыгчыся, не хадзіць кашлатым. У выніку з'явілася мянушка Амелька Кашлаты, якую журналіст пасля ўзяў за літаратурны псеўданім...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Даніна пашаны

САДЖАНЦЫ Ў ГОНАР ЗАГІНУЛЫХ...

Па благаславенні протаіерэя Фёдара Поўнага грамадскія арганізацыі Беларусі і духавенства пачалі аднаўленне таполевай алеі ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец». Першы крок у гэтым кірунку быў зроблены падчас рэспубліканскага суботніка.

Фота БРСМ.

Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны, Беларускі культурны цэнтр духоўнага Адраджэння і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі выйшлі з ініцыятывай пачаць аднаўленне гісторыка-культурнай каштоўнасці — таполевай алеі ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец». У рамках мемарандума аб супрацоўніцтве ў час рэспубліканскага суботніка прадстаўнікі грамадскіх арганізацый патрыятычнай накіраванасці і асноўных канфесій Беларусі дзеля памяці аб расстраляных і спаленых людзях высадзілі побач з легендарнымі таполямі дваццаць маладых саджанцаў.

Дырэктар Беларускага культурнага цэнтра духоўнага Адраджэння Аляксандр Госцеў упэўнены, што рашэнне аб аднаўленні гістарычнай алеі было прынята вельмі своечасова. Ён расказаў, што ў 1944 годзе па загадзе кіраўніцтва канцлагера з двух бакоў уздоўж нешырокай дарогі, якая вядзе ад Магілёўскай шашы да Трасцянецкага лагера, вязні высадзілі маладыя таполі. Па гэтай дарозе смерці на расстрэлы і спаленне прайшлі сотні тысяч людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў: мірныя жыхары Беларусі, у тым ліку вязні Мінскага гета, савецкія ваеннапалонныя, удзельнікі антыфашысцкай падпольнай барацьбы і партызанскага руху, прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва Заходняй Еўропы, дэпартаваныя ў Мінск для знішчэння. Час няўмольны і да жывых сведкаў тых трагічных падзей — таполяў, якія перажылі гэтую страшную гісторыю і маўкліва захоўваюць памяць пра ахвяр Трасцянца. Сёння шматлікія дрэвы ўжо загінулі ад старасці. Таму прынятае рашэнне аб аднаўленні таполевай алеі вельмі своечасовае, лічыць Аляксандр Госцеў. «А ў перспектыве мы плануем пасадзіць таполі на ўсе часткі алеі, якія захаваліся».

Па колькасці ахвяр фашызму Трасцянец стаў чацвёртым месцам пасля Асвенціма, Майданака і Трэблінкі. 22 чэрвеня 2015 года на месцы канцлагера адкрыты мемарыяльны комплекс «Трасцянец» з дзесяціметровым цэнтральным манументам «Брама памяці».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Акордамі душы

«ВСПОМНЮ Я ПЕХОТУ...»

На Віцебшчыне стартаваў інтэрнэт-чэлендж «Песні Перамогі». Яго запусціў абласны камітэт БРСМ пры падтрымцы абласнога аб'яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў, абласнога савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Чэлендж відэаролікаў будзе доўжыцца да 30 красавіка ўключна ў рамках рэспубліканскага патрыятычнага праекта «Кветкі Вялікай Перамогі».

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя незалежна ад узросту. Галоўная ўмова — выканаць дзве песні пра вайну, адна з якіх павінна быць пададзена ў сучасным фармаце спеваў з захаваннем духу і атмасферы ваеннага перыяду.

Удзельнікам прапануецца выканаць як песні пра вайну часоў 1941—1945 гадоў, так і кампазіцыі сучасных аўтараў адпаведнай тэматыкі. На відэа могуць прысутнічаць як сольныя выканаўцы, так і вакальныя калектывы.

Свае відэаролікі ўдзельнікі могуць дасылаюць у афіцыйную суполку Віцебскай абласной арганізацыі БРСМ у «УКантакце», публікаваць у асабістых акаўнтах у Instagram з хэштэгамі #брсмво, #ПесниПобеды, #Беларусьпомнит, #молодежьпомнит. Аўтары найлепшых работ будуць узнагароджаны спецыяльнымі дыпломамі і прызамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Схіляючы галаву

Захаваем памяць аб героях

З сакавіка валанцёрскія атрады БРСМ праводзяць работы па добраўпарадкаванні воінскіх пахаванняў, помнікаў ваеннай гісторыі. Ужо цяпер у рамках акцыі «Захаваем памяць на стагоддзі» ў Гродзенскай вобласці праведзена каля ста мерапрыемстваў.

Фота Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ.

У Смаргонскім раёне хлопцы і дзяўчаты добраўпарадкавалі помнік загінулым танкістам у аграгарадку Солы, у Свіслачы навялі парадак каля мемарыяльнага комплексу «Асілак», у Бераставіцкім раёне — каля помніка Маці, якая смуткуе. Актывісты Шчучынскага раёна прыбралі каля 20 помнікаў савецкіх воінаў і партызанаў, брацкіх магіл ахвяр фашызму Вялікай Айчыннай вайны.

«Прыцягненне да такіх акцый служыць чарговым напамінам маладым пакаленням аб страшных наступствах і ахвярах вайны. Валанцёры БРСМ з задавальненнем прымаюць удзел у акцыі, і кожны змог унесці свой уклад у захаванне гістарычнай памяці пра подзвігі беларускага народа, — кажа першы сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Ганна Сарасек. — Акрамя таго, у рамках акцыі нашы актывісты арганізоўваюць віншаванні ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў з дзяржаўнымі святамі, знамянальнымі датамі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Погляд праз час

«ЛІСТ ГЕРОЮ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ»

Патрыятычны праект пад такой назвай распачалі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская піянерская рэспубліканская арганізацыя.

Фота БРСМ.

Да ўдзелу запрасілі навучэнцаў школ, гімназій і ліцэяў, устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, студэнтаў ВНУ, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і рухаў. Напярэдадні Дня Перамогі і Дня Незалежнасці ім прапанавана напісаць ліст з дня сённяшняга ў мінулае — на фронт свайму, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны. Затым скласці яго ў знакаміты трохкутнік і перадаць у першасную арганізацыю БРСМ школы, ВНУ, прадпрыемства альбо арганізацыі.

Усе лісты-трохкутнікі будуць акумуляваны ў раённых, гарадскіх і абласных камітэтах, дзе на конкурснай аснове пройдзе адбор найлепшых творчых работ. Іх перададуць у Цэнтральны камітэт БРСМ, а затым — у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. «Ліст Герою Вялікай Перамогі» — частка вялікага рэспубліканскага праекта «Кветкі Вялікай Перамогі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ваявалі і зброяй, і мастацкім словам

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У Музеі народнай славы захавалася некалькі нумароў «Чырвонкі». У адным з артыкулаў пад загалоўкам «Два Іваны» расказваецца пра двух цёзак — Івана Сініцкага, які праславіў свой край працай, і Івана Шмяля, які прайшоў дарогамі вайны. Лёсы гэтых людзей цесна пераплятаюцца. Іван Сініцкі, вядомы бульбавод краіны — саўгаса «Загаліцкі», кавалер ордэна Працоўнай славы трох ступеняў, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, першым рапартаваў аб заканчэнні ўборкі бульбы на ўсёй 60-гектарнай плошчы. «Ураджайнасць склала 474 цэнтнеры з кожнага гектара. Такой колькасці другога хлеба звяно Івана Сініцкага яшчэ ніколі не збірала. Яго члены вырошчваюць бульбу ўжо восьмы год», — піша аўтар артыкула.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На першай старонцы «Чырвоная змена» вяла маладзёжную «Дошку гонару», куды заносіліся прозвішчы перадавікоў вытворчасці, сельскай гаспадаркі, сацыялістычнага спаборніцтва, у тым ліку і з Любаншчыны.

У адным з нумароў за 1961 год газета расказвае пра Цімафея Дзмітрыевіча Анісімава, які разам з сябрамі прыехаў на Палессе, стварaў камуну, а затым нейкі час быў старшынёй калгаса. Шмат увагі газета ўдзяляла легендарнаму кіраўніку калгаса «Чырвоная змена» Кузьме Іванавічу Шаплыку, які заступіў на пасаду 27 снежня 1947 года і прапрацаваў на ёй 50 гадоў.

З «Чырвонкай» непарыўна звязаны лёс і **мясцовага краязнаўцы, педагога Анатоля ВЯЛІЧКІ:**

— Калісьці я працаваў сакратаром партыйнай арганізацыі ў Гарадзяцічах. У вёсцы была старая школа — пасляваенны драўляны будынак. Затым з яе зрабілі сярэднюю школу, стала недастаткова месцаў, не было спартзалы, сталовай. І я пісьмова звярнуўся ў ЦК камсамола Беларусі і «Чырвоную змену», маўляў, дапамажыце пабудаваць новую школу. Газета надрукавала мой зварот, які меў рэзананс. Хутка ў раён даслалі паперу, што будзе новая навучальная ўстанова. У выніку з'явіўся прыгожы двухпавярховы будынак.

На той час друк быў сапраўднай сілай. На крытычную заўвагу абавязкова павінны былі адказаць. І газета трымала пытанне на кантролі, канстатуе мой суразмоўнік.

— Я, як сакратар партарганізацыі, устанаўліваў памятную дошку на доме Марфы Мігун, дзе друкаваліся «Звязда» і «Чырвоная змена». Папярэдне праводзіў рэпетыцыі ўрачыстай цырымоніі адкрыцця, бо на яе прыехала каля 300 чалавек, у тым ліку рэдактары «Звязды», «Чырвонкі», сакратары ЦК камсамола, партыі, — згадвае краязнаўца Анатоль Вялічка. — Але не ўсе ведаюць, што дзве гэтыя газеты адным часам друкаваліся і на востраве Добры, што ў Акцябрскім раёне. Адбылося гэта пасля таго, як на Любаншчыне фашысты пачалі чарговую карную аперацыю. Друкарскі станок вывезлі на коннай павозцы.

Дарэчы, шрыфт і абсталяванне для падпольнай друкарні, дзе выдаваліся «Чырвоная змена» і «Звязда», партызаны здабылі ў нямецкім гарнізоне, які разбілі 7 лістапада 1941 года. Гэтыя выданні надавалі людзям сілы ў барацьбе з захопнікамі, упэўненасць у перамозе. Газеты чыталі на адным дыханні і перадавалі з рук у рукі.

— З цікавасцю чытаю «Чырвоную змену» і сёння. Мне падабаецца, што сучаснае выданне ўздымае праблемы выходзячы з таго, як бы хацелася сучаснаму пакаленню бачыць гэты свет. Жадаю поспехаў, каб творчы калектыў быў на плыву, пісаў праўду, тое, што трэба чытачу, — сказаў напрыканцы размовы наш даўнішні аўтар і чытач.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

КАЛЕКТЫВУ ГАЗЕТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»

Паважаныя калегі, шаноўныя ветэраны журналістыкі!

Прыміце шчырыя віншаванні са знамянальнай падзеяй — 100-годдзем з дня выхаду першага нумара газеты «Чырвоная змена».

100 гадоў — немалы адрэзак часу. Дзякуючы прафесійнай творчай працы зладжанага рэдакцыйнага калектыву выданне трывала замацавалася на інфармацыйным полі краіны. Газета мае не толькі багатую гісторыю, але і традыцыі, свой стыль. Стваральнікам «Чырвонкі» заўсёды былі ўласцівыя высокі прафесіяналізм, зацікаўленае стаўленне да справы, пачуццё адказнасці і самаадданасць.

На старонках выдання друкавалі свае літаратурныя творы многія вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты, сярод якіх Мікола Аўрамчык, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Законнікаў, Іван Пташнікаў, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў, Уладзімір Караткевіч.

Прыемна адзначыць, што адзінае беларускамоўнае выданне для моладзі на працягу стагоддзя заставалася і застаецца верным свайму стылю. Асаблівае значэнне мае сацыяльная скіраванасць вашых матэрыялаў. Праблемы патрыятычнага выхавання, адукацыі, аховы здароўя, папулярызацыя сямейных каштоўнасцяў, беражлівага стаўлення да зямлі разглядаюцца ўдумліва, з любоўю да Беларусі.

За доўгі час існавання газета знайшла і ўтрымала сваіх чытачоў, стала для іх памочнікам у вырашэнні штодзённых праблем, сапраўдным сябрам, кампетэнтнай крыніцай інфармацыі.

Няхай любімая праца прыносіць вам толькі задавальненне, а для новых здзяйсненняў і праектаў заўсёды хапае сіл і энергіі.

Ад усяго сэрца жадаю супрацоўнікам і ўсім сябрам рэдакцыі, шаноўным ветэранам моцнага здароўя, дабрабыту, адданасці чытачоў, натхнення.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Уладзімір ПЯРЦОЎ.

РЭДАКЦЫЙНАМУ КАЛЕКТЫВУ ГАЗЕТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»

Дарагія калегі і сябры!

Ад імя Цэнтральнага камітэта Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і сябе асабіста горача і сардэчна віншую вас з векавым юбілеем найстарэйшай у Беларусі, але самай маладой душой газеты пра моладзь і для моладзі.

Аднагодка маладзёжнага руху краіны — «Чырвоная змена» — беражліва захоўвае гісторыю партызанскай друкарні на востраве Зыслаў, сяброўства з беларускім касманаўтам Пятром Клімуком, разам з якім «пабывала» ў космасе. Гэтая па-сапраўднаму творчая лабараторыя выгадавала не адно пакаленне таленавітых «чырванаменаўцаў» — журналістаў-аднадумцаў, вядомых пісьменнікаў і публіцыстаў.

«Чырвоная змена» і сёння знаходзіцца ў гушчы маладзёжных падзей, ярка і нестандартна распавядае аб дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы, ініцыятывах таленавітых юнакоў і дзяўчат, прапагандуе грамадзянска-патрыятычнае, працоўнае выхаванне, здаровы лад жыцця ў маладзёжным асяроддзі.

У знакавы юбілей газеты прыміце пажаданні моцнага здароўя на доўгія гады, шчасця і дабра, новых поспехаў, слаўных пачынанняў і плённай працы ў вялікай справе — выхаванні маладога пакалення!

З глыбокай павагай за вашу працу
Дзмітрый ВАРАНЮК,
першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ,
член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь

ДАРАГІЯ СУПРАЦОЎНІКІ ГАЗЕТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», ШАНОЎНЫЯ КАЛЕГІ!

Факультэт журналістыкі БДУ сардэчна віншуе вас са 100-годдзем! Век пражыць — не поле перайсці. І гэта праўда. Цягам часу вам удалося шмат: навучыць, выхаваць і далучыць да сваёй каманды шэраг таленавітых, здольных да журналісцкай працы спецыялістаў, назаўжды адданых рабоце сэрца і душы. Шмат практыкантаў і выпускнікоў факультэта журналістыкі звязалі свой творчы і грамадзянскі лёс менавіта з вашым выданнем, таму што «Чырвоная змена» — гэта і маладзёжная дзёрзкасць, і журналісцкі пошук, і апантанасць праблемамі часу, і аб'ектыўнасць аналізу.

Газета зрабіла свой значны ўнёсак як у нацыянальную журналістыку, так і ў нацыянальную культуру ўвогуле. У розныя гады ў штаце рэдакцыі працавалі вядомыя беларускія пісьменнікі, тут адбылося адкрыццё таленту многіх вядомых сёння беларускіх журналістаў.

Для факультэта журналістыкі «Чырвоная змена» — надзейны сябар, партнёр, дарадца. Мы ўдзячныя вашаму калектыву за падтрымку і супрацоўніцтва, дапамогу ў рэалізацыі сумесных праектаў і выхаванні маладога пакалення журналістаў.

У юбілейны год шчыра зычым вам доўгага здароўя, шчасця, поспехаў, плённай працы, захапляльных інфармацыйных нагод і яскравых публікацый. Вы мудрыя і вопытныя, але разам з тым маладыя, жыццярадасныя, напоўненыя свежымі ідэямі і памкненнямі да новых вяршынь. Жадаем захоўваць ваш прафесійны падыход і любоў да справы. Будзьце заўсёды і ва ўсім на вышыні!

З самымі шчырымі віншаваннямі
ад усяго калектыву журфака БДУ
дэкан В. М. САМУСЕВІЧ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 мая 2021 года проводит 10-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
111	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 0767 1980 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 404763 дв. 207424 1980 г. *3 кат. 1704 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 800,00	1 160,00
112	Специальный автомобиль ЗиЛ-131Н с кузовом-фургоном К2-131 в составе: кузов-фургон К2-131 № 01310 1986 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131Н ш. 724469 дв. 790655 1986 г. *4 кат. 1077 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
113	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 03556 1982 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 481577 дв. 611281 1982 г. *4 кат. 1227 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
114	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 12195 1980 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 420403 дв. 289857 1980 г. *4 кат. 1380 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
115	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 11113 1980 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 410935 дв. 239754 1980 г. *4 кат. 1111 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
116	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 09384 1985 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 630892 дв. 413520 1985 г. *4 кат. 1036 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
117	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 12625 1982 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 568554 дв. 053181 1982 г. *3 кат. 1815 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 800,00	1 160,00
118	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 04300 1987 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 737347 дв. 849543 1987 г. *4 кат. 1208 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 800,00	1 160,00
119	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 03334 1983 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 530009 дв. 858569 1983 г. *4 кат. 2455 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
120	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 08490 1982 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 502027 дв. 648893 1982 г. *4 кат. 1400 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
121	Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 05139 1981 г. *2 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 351892 дв. 401459 1981 г. *3 кат. 1454 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	8 400,00	1 680,00
122	Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К-375 в составе: кузов-фургон К-375 № 1154 1979 г. *2 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 309022 дв. 998145 1979 г. *3 кат. 1691 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	8 400,00	1 680,00
123	Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном КБ2-375 в составе: кузов-фургон КБ2-375 № 04671 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 446637 дв. 617364 1986 г. *4 кат. 1599 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	8 200,00	1 640,00
124	Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 09519 1985 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 441360 дв. 476054 1985 г. *4 кат. 1461 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	8 200,00	1 640,00
125	Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 04249 1988 г. *2 кат.* Автошасси Урал-43203-1012 ш. 095662 дв. 240731 1988 г. *3 кат. 363 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	14 000,00	2 800,00
126	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 04651 1985г. *4кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 634538 дв. 370338 1985 г. *4кат. 1070 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
127	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 12641 1984 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 620130 дв. 301326 1984 г. *4 кат. 1091 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00
128	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131 № 08264 1985 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 646980 дв. 428411 1985 г. *3 кат. 1485 км*	г. Гомель в/ч 01313-Г	5 700,00	1 140,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 27 мая 2021 г. в 10.00.
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 24 мая 2021 года.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 27 мая 2021 г. с 9.15 до 10.00.
Победитель аукциона обязан:
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС. Справки по тел./факсу (017) 319 35 41. Извещение опубликовано на сайтах: http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/

Организатор торгов	Ликвидатор общества с ограниченной ответственностью «Грибоедофф» – ООО «Парусник»: 210029, г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 11; тел.: 8 0212 68 75 96, +375 44 585 88 52
Продавец	Общество с ограниченной ответственностью «Грибоедофф», тел.: 8 0212 68 75 96, +37544 585 88 52
Дата, время, место и форма проведения торгов	Торги в форме открытого аукциона **28.05.2021 года в 12.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 48, каб. 11
Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним и начальная цена предмета торгов (без НДС)	**Лот № 1:** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-78132, площадь – 990,4 кв. м, наименование – теплица для выращивания грибов и административно-бытовое помещение. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 221287002601000065, земельный участок принадлежит продавцу на праве аренды (св-во № 200/1401-5909 от 24.08.2012); Оборудование для выращивания грибов (климатическое, воздухоохладительное, вентиляционное, относящееся к очистке воды, системы управления микроклиматом, измерения CO^2, а также котлы длительного горения). **Начальная цена** – 418 593,54 бел. руб. Ознакомиться с предметом торгов, а также узнать подробную информацию можно в пн.-пт. с 9.30 до 16.30 по тел.: 8 0212 68 75 96, +375244 585 88 52. Срок для ознакомления – до окончания приема заявок на участие в торгах
Место нахождения предмета торгов	Витебская обл., Витебский р-н, д. Васильки, ул. Центральная, д. 22
Порядок проведения торгов	Торги проводятся в день, время и месте, указанные в извещении. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота. Победителем торгов признается лицо, предложившее наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в торгах подано заявление только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов имеет право не позднее, чем за 5 дней до начала снять с аукциона предмет торгов или отказаться от проведения торгов
Порядок оплаты приобретенного предмета торгов	Участник, выигравший торги, обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 15 банковских дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов
Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для перечисления	Задаток устанавливается в размере 10 % от начальной цены лота и подлежит зачислению по следующим реквизитам: р/с BY27AKBB21202900079512000000, БИК AKBBBY2X, в ОАО «АСБ «Беларусбанк» Витебское областное управление, УНП 391509556, получатель платежа – ООО «Грибоедофф», назначение платежа – задаток за участие в торгах по лоту № 1. Задаток подлежит внесению до подачи заявления на участие в торгах. Заверенный банком платежный документ, подтверждающий внесение задатка, прилагается к заявлению
Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах	1. Заявление на участие в торгах; 2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка; 3. Копия и подлинник устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации; доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица – для юридических лиц – резидентов РБ; 4. Легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для юридических лиц, иных организаций – нерезидентов РБ; 5. Копия и подлинник свидетельства о государственной регистрации – для ИП – резидентов РБ; 6. Легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для ИП – нерезидентов РБ; 7. Нотариально удостоверенная доверенность – для представителя гражданина РБ, индивидуального предпринимателя; 8. Легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык – для представителя иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента РБ. При подаче документов физическое лицо, ИП, представитель физического лица, ИП, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал и копию документа, удостоверяющего личность
Сроки начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов	Заявления на участие в торгах и прилагаемые к ним документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения в печатных СМИ **до 17.00 27.05.2021 года** по адресу: 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 48, каб. 11, а также на e-mail: parusnik-vitebsk@hotmail.com. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата ее регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах
Возмещение затрат на организацию и проведение торгов	Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производятся участником, выигравшим торги, по фактическим затратам. Участник, выигравший торги, обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов
Порядок оформления участия в торгах	К участию в торгах допускаются лица, подавшие Организатору торгов в установленный срок заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у Организатора торгов и получить аукционные номера
Порядок оформления результатов торгов	Участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в 2 экземплярах в день проведения торгов. Протокол о результатах торгов утверждается Организатором торгов в день их проведения
Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов	После предъявления участником, выигравшим торги, копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, между Продавцом и участником, выигравшим торги, заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть заключен не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by
Предмет электронных торгов	
Правильно-гибочный автоматический центр FORMULA 14 EVO 2014 г. в., инв. номер 41204. Месторасположение: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 174	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 181 728,00 бел. руб.	
Условия самовывоза и демонтажа	Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводятся за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов – 26.05.2021 в 12.00.** **Окончание торгов – 26.05.2021 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.05.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: **auction@cpo.by**

Утерянный договор страхования форма «Зеленая Карта» (все страны) 15 дней серии BY07 № 17689110 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительным.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «АМКОДОР-СЕМАШ»

ИНФОРМАЦИЯ об акционерном обществе и его деятельности (Форма 1)

4. Доля государства в уставном фонде эмитента 0 % (всего, в процентах)

5. Количество акционеров – всего 145, в том числе: юридических лиц – 2, из них нерезидентов Республики Беларусь – 0, физических лиц – 143,из них нерезидентов Республики Беларусь – 1.

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	1,72	1,64
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук	1556	1556
В том числе: поступивших в распоряжение общества	1556	1556	1556

дата поступления акций на счет «депо» общества	количество акций, штук	Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества
22.08.2013	1556	30 лет

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	15 263,00	7388,00
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	15 034,00	7828,00
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	178,00	-426,00
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	229,00	-440,00
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей	129,00	38,00
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей	-180,00	-24,00
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей	69,00	-47,00
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	109,00	-379,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тысяч рублей	-1706,00	-1815,00
Долгосрочная дебиторская задолженность	тысяч рублей	50,00	0,00
Долгосрочные обязательства	тысяч рублей	851,00	833,00
8. Среднесписочная численность работающих	человек	147	146

9. Основные виды продукции или виды деятельности: 28229 – Производство прочих машин и оборудования для сельского и лесного хозяйства.

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров – 29.03.2021 г.

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 25.03.2021 г.

Аудит проведен: Общество с ограниченной ответственностью «АСБ Консалт», 220030, г. Минск, ул. Мясникова, 32, к. 301, зарегистрировано Минским горисполкомом 27.05.2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей с регистрационным номером 192482938.

Период, за который проводился аудит: за 2020 г.

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности: По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «АМКОДОР-СЕМАШ» – управляющая компания холдинга» по состоянию на 31 декабря 2020 года, финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

13. Сведения о применении обществом Свода правил корпоративного поведения: ознакомлены.

14. Официальный сайт Общества: www.amkodor-dz.by

Генеральный директор О. А. Корсак

Главный бухгалтер И. Е. Жигалко

Нябачныя масты

ЗРАЗУМЕЦЬ ПСІХАЛОГІЮ ХАТНЯГА ГАДАВАНЦА

Ва ўсіх людзей бываюць праблемы ці проста цяжкія дні, пасля якіх проста неабходна з кімсьці пагаварыць і атрымаць параду, як паступіць у той ці іншай сітуацыі. У такія моманты раяць схадзіць на сеанс да псіхолага. Але што ў падобных выпадках рабіць нашым хатнім гадаванцам, у якіх таксама бываюць дэпрэсіі і зрывы ў паводзінах? Адказ на гэтыя і іншыя пытанні ведае наша гераіня — зоапсіхолог Кацярына КАСТРЫЦКАЯ.

— З псіхалогіяй жывёл працую ўжо дзесьці чатыры гады. Знаёмства з гэтай галіной адбылося, калі я вучылася ў магістратуры Манчэстэрскага ўніверсітэта ў Вялікабрытаніі. Я абараняла магістарскую працу па анімалатэрапіі — гэта псіхалагічнае кансультаванне і рэабілітацыя з прыцягненнем жывёл. А каб апошнія маглі стаць бяспечнымі і карыснымі ўдзельнікамі гэтага працэсу, неабходна было навучыцца глыбока разумець асаблівасці іх паводзін, а таксама ўмець патлумачыць ім тое, што ад іх патрабуецца. Менавіта з гэтай прычыны я скончыла мноства розных курсаў у Ізраілі, Вялікабрытаніі, ЗША і г. д. Пасля абароны магістарскай і павышэння ведаў вырашыла і далей развівацца ў сферы зоапсіхалогіі паралельна з вывучэннем звычайнай. На дадзены момант я кансультую ўладальнікаў сабак і катоў з нагоды іх навучання і вырашэння праблем паводзін жывёл, працую з тымі, ад каго адмовіліся і падабралі на вуліцы, дапамагаю з выбарам для канкрэтнага чалавека або сям'і жывёлы і пароды. А таксама дапамагаю людзям вырашаць псіхалагічныя праблемы, у тым ліку з дапамогай сваіх жывёл, пішу артыкулы пра навучанне, паводзіны і псіхалогію хатніх гадаванцаў, дрэсіруе сабак і нават стала суаўтарам кнігі «Добры сабака дрэннай пароды не бывае».

Фота Таіны ЦЮРЫНАЙ.

Падчас гутаркі Кацярына тлумачыць, што спецыяльнасці «Зоапсіхолаг» як такой не існуе — у пераліку прафесій мы не зможам яе знайсці. Правільней было б казаць «Спецыяліст па паводзінах жывёл». Але па нейкіх прычынах назва «зоапсіхолаг» прыжылася ў шырокай публіцы, яна больш зразумелая людзям. Гэтак жа часта зоапсіхолагаў блытаюць з дрэсіроўшчыкамі, але гэта таксама розныя паняцці. Першы наладжвае ўмовы жыцця жывёлы, а другі — той, хто навучае яе камандам. Хоць, безумоўна, гэтыя прафесіі ўзаемазвязаны паміж сабой і работа ў адной патрабуе навыкаў з іншай.

— Звычайна галоўныя праблемы, з якімі да мяне прыходзяць на кансультацыю гаспадары пацыентаў, — сітуацыі, калі паводзіны жывёл сталі ўскладняць ім жыццё. Гэта могуць быць агрэсія гадаванца, якая праяўляецца ў адносінах да незнаёмых людзей, іншых жывёл або нават да саміх уладальнікаў, неахайнасць, дэструктыўныя паводзіны: псаванне рэчаў, непаслушэнства, а таксама праблема выцця і брэху сабак у адзіноце. Вельмі рэдка, але бывае, што звяртаюцца гаспадары шчанюкоў ці толькі што ўзятых у дом дарослых сабак з просьбай дапамагчы з самага пачатку зрабіць усё правільна. Такія ўладальнікі выклікаюць вялікую павагу, і, вядома, з імі вельмі прыемна працаваць, бо заўсёды прасцей навучыць жывёлу адразу паводзіць сябе правільна, чым потым перавучваць.

Наша суразмоўніца тлумачыць, што галоўным складнікам яе паспяховай работы з'яўляецца тое, што яна разумее мову жывёл. Сцвярджае, што навучыцца ёй нескладана, галоўнае — жаданне. Асаблівасці мовы жывёл залежаць ад іх віду. Напрыклад, калі сабака махае хвастом — гэта сігнал узбуджэння, магчыма, радасці, але неабавязкова. Калі махае хвастом кошка — гэта відавочнае раздражненне.

— У рабоце з жывёламі я выкарыстоўваю толькі гуманныя метадыкі, заснаваныя на навуковым падыходзе. У мяне заўсёды жылі самыя розныя гадаванцы: сабакі, кошкі, хамякі, белыя мышы, папугаі, канарэйкі, чыжы, шчаглы, коні. Цяпер у мяне толькі два сабакі і конь, якіх я вельмі люблю, яны для мяне як члены сям'і.

Наша гераіня кажа, што, на жаль, не ўсе людзі разумеюць, што метад перніка нашмат больш эфектыўны, чым пугі. Менавіта таму стаўленне Кацярыны да цырка рэзка адмоўнае.

Яна разумее мову жывёл. Сцвярджае, што навучыцца ёй нескладана, галоўнае — жаданне.

Фота Юліі СЁМУХІ.

— Існуе міжнародная канцэпцыя ацэнкі добрага жыцця жывёл, у тым ліку дзікіх, якія апынуліся воляй выпадку пад апекай чалавека. Да цыркавых гэта таксама адносіцца. Гэта канцэпцыя «пяці свабод», дзе дакладна прапісаны ўмовы, у якіх павінны ўтрымлівацца жывыя істоты. Ні адна з іх у цырку і кантактным заапарку часцей за ўсё не выконваецца і блізка. Першая канцэпцыя — свабода ад голаду і смагі. Публіка не можа бачыць, наколькі добра кормяць жывёл і ці ёсць у іх пастаянны доступ да вады. Аднак зоаабаронцы, якія праводзяць расследаванні, сцвярджаюць, што часта «артыстаў» мардуюць голадам, каб «зматываваць» на працу, і падмацоўваюць гэтыя сцвярджэнні доказамі. Акрамя таго, пражываючы ў цырках, жывёлы адчуваюць дыскамфорт. З-за ўтрымання ў клетках яны ўвесь час пакутуюць ад шуму, не маюць магчымасці паўнавартасна адпачываць. Выкарыстоўваецца негуманная амуніцыя. Ну і, вядома ж, варта адзначыць, што яны абсалютна пазбаўлены волі. Жывёла павінна мець магчымасць жыць у максімальна набліжаных да натуральных умовах і паводзіць сябе ў адпаведнасці з відавой прыналежнасцю. З тым, што гэтая свабода не задавальняецца, не будзе спрачацца нават самы заўзяты абаронца цыркаў.

Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Свая атмасфера

САБАКІ МНОГА НЕ БЫВАЕ!

Калі гаворка заходзіць пра хатніх жывёл, большасць з нас найчасцей уяўляе гадаванцаў малых або сярэдніх памераў. Многія вельмі пазітыўна рэагуюць на вялікіх сабак на вуліцы, хоць самі не могуць адважыцца завесці ўлюбёнца такіх габарытаў. Вырашальнае месца ў пытанні адыгрывае жыллоплошча: лічыцца, што для вялікага сабакі патрэбны дом. Але некаторых гэта акалічнасць абсалютна не палохае, і яны выдатна жывуць з такімі гадаванцамі ў кватэры.
Мы знайшлі дзвюх гераінь, у якіх было моцнае жаданне завесці менавіта вялікую хатнюю жывёлу, і яны гэта зрабілі.

Ірына Штафурак больш за дзесяць гадоў рыхтавалася да набыцця сабакі, таму што хацела пэўную пароду — сенбернара. Гэта вельмі добрая і крыху гультаяватая жывёла, якая не любіць шмат гуляць, таму добра будзе адчуваць сябе як у доме, так і ў кватэры. Сямідзесяцікілаграмовага ўлюбёнца нашай гераіні клічуць Каспер, яго любімыя заняткі — паесці і паляжаць, прытым пажадана, каб падчас адпачынку яму чухалі жывот. Ірына і сама не асабліва актыўная, таму іх стылі жыцця вельмі супадаюць.

Каспер лагодна ставіцца да ўсіх людзей, асабліва любіць дзяцей. На вуліцы малыя заўсёды яго заўважаюць і просяць пагладзіць — ад такога задавальнення ён ніколі не адмаўляецца. Адзінае, што выклікае складанасці ў такіх выпадках, — яго габарыты: сенбернары не адчуваюць сваёй вагі і памераў, таму могуць зусім не спецыяльна зваліць дзіця з ног.

Нягледзячы на бязмежную любоў да людзей, Каспер праяўляе агрэсію да іншых сабак. На жаль, калі ён быў маленькі, яго пакусаў пітбуль. Заняткі з кінолагам не дапамаглі, таму гаспадыні даводзіцца гуляць з сенбернарам толькі ноччу, у месцах, дзе няма жывёл, абавязкова мець ланцужок і на ўсялякі выпадак электрашокер для сенбернара.

Другая гераіня без асаблівых роздумаў узяла ў кватэру лабрадора, бо ў яе ўжо быў вопыт утрымання вялікіх сабак. У дзяцінстве ў Ірыны Дутко была аўчарка, потым — мопс, а цяпер — лабрадор Лакі. Гэта сямейная, рухомая і гуллівая парода.

Як кажа сама гаспадыня, самым цяжкім быў першы год, калі сабака грыз усё, што траплялася яму пад лапы. У ежы Лакі настолькі неперабораліві, што часам мог «перакусіць» забытымі шкарпэткамі. Лабрадоры не толькі гуллівыя, але і вельмі разумныя, таму з часам сабака навучыўся адкрываць халадзільнік і выцягваць ежу. Цяпер кухня ад Лакі надзейна зачынена.

Іра з сабакам ходзіць у лес, які знаходзіцца побач з іх домам, гуляюць звычайна тры разы на дзень па гадзіне. З лабрадорам абавязкова трэба гуляць на свежым паветры, у такіх пародзе шмат энергіі, якую трэба выпускаць.

Ірына ўсё ж трохі пашкадавала аб тым, што завяла такую вялікую сабаку ў кватэры, бо жыве яна на другім паверсе. І бывае вельмі чуваць для суседзяў знізу, калі Лакі злазіць з канапы. Але на любоў да Лакі гэта ніяк не паўплывала.

Ірына СІНЬКЕВІЧ, студэнтка V курса факультэта журналістыкі БДУ.

Знайсці сябе

«Першымі кліентамі былі любімыя цешча і жонка»,

або Манікюр і педыкюр па-мужчынску

Мяжа паміж жаночымі і мужчынскімі прафесіямі ўжо даўно сцёртая. Гэта пацвярджае і Дмітрый ВЯРКЕЕНКА з Магілёва, па спецыяльнасці — выкладчык выяўленчага мастацтва, а ў жыцці — майстар... манікюру і педыкюру. Дарэчы, герой мае пяты, вышэйшы разрад! Ужо чатыры гады ён наводзіць прыгажосць на пазногцях і спыняцца ў гэтай справе не збіраецца.

— Адвучыўшыся ў Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, я паступіў на завочнае аддзяленне ў Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Машэрава на мастака-графіка. Пакуль атрымліваў вышэйшую адукацыю, паралельна выкладаў у каледжы мастацтваў класічны жывапіс: вучыў маляваць натуру, нацюрморты. А пасля пяць гадоў адпрацаваў педагогам у вучылішчы культуры. Потым была армія, адслужыў прапаршчыкам тры гады, а затым вырашыў вярнуцца да цывільнага жыцця. Захапленне маляваннем засталося, да таго ж жонка Вольга ўжо працавала некалькі гадоў у б'юці-сферы, і мы падумалі: а чаму б не развівацца ў такім кірунку разам? Маўляў, гэта будзе нашай фішкай — мужчына, які робіць пазногці прыгожымі. Але для нас вельмі важна не толькі эстэтычнасць, але і здароўе, таму паралельна з гэтым я атрымаў кваліфікацыю падолага — спецыяліста па праблемах з пазногцямі і ступнямі ног.

Падалогія — сучасная галіна дэрматалогіі, якая займаецца пытаннямі догляду і лячэння скуры ступняў і пазногцяў пальцаў на нагах. Асаблівая ўвага аддаецца прафілактыцы і лячэнню захворванняў стоп, у першую чаргу грыбковых паражэнняў.

Дзмітрый кажа, што быў упэўнены, што ў яго ўсё атрымаецца, таму лёгка зрабіў крок у невядомасць.

— Калі пачаў навучацца гэтай прафесіі, першымі кліентамі былі любімыя цешча і жонка. Яны ж свае, родныя, так што цярпелі *(усміхаецца)*. Пасля таго, як я скончыў курсы ў Магілёве, уладкаваўся ў манікюрны салон, дзе ўжо працавала Вольга. Праз некаторы час мы вырашылі адкрыць уласны. Пастаянныя наведвальніцы спачатку здзіўляліся і крыху сароміліся мяне, але ў хуткім часе прывыклі. А ў мяне ніколі не было нялоўкасці — часам толькі складана знайсці агульную мову з незнаёмым чалавекам, асабліва з жанчынай. З мужчынамі ў гэтым плане нашмат лягчэй. Можна абмеркаваць футбол, будоўлю, службу ў войску. Яны прыходзяць радзей, але добра, што ўвогуле наведваюць і даглядаюць сябе. У такой сферы трэба быць добрым псіхолагам, умець зрабіць так, каб чалавек расслабіўся, адчуў сябе камфортна, не камплексаваў.

У Дзмітрыя клиенты рознага ўзросту: ад школьнікаў да пенсіянераў. Запыты ў іх таксама розныя.

— Пэўнага трэнду на пазногці не назіраю, бо кожны прыходзіць за тым, што яму бліжэй, чаго хочацца ў дадзены момант. Хтосьці любіць кіслотныя пазногці, са стразамі, а нехта аддае перавагу нюдавым, аднатонным адценням. Да розных свят звычайна просяць намаляваць нешта адпаведнае: калі гэта Новы год — снегавікі, сняжынкі, елкі, калі 8 Сакавіка — ружы, цюльпаны, мімозы. У мяне багатая палітра малюнкаў на любы густ. У цэлым цяпер большасць прыходзіць па яркія пазногці, бо апошнім часам было шмат розных не вельмі пазітыўных падзей: многія заседзеліся дома на каранціне, засумавалі і таму хочуць чагосьці вясёлага. Яшчэ зараз амаль не заказваюць складаныя ўзоры, малюнкі на пазногцях.

Дзмітрый увесь час павышае кваліфікацыю, наведваючы розныя курсы як у Расіі, так у нашай краіне.

— Зараз, на жаль, пандэмія ўнесла свае карэктывы, але ёсць і анлайн-курсы, якія я таксама праходжу. Увогуле, у маёй сферы важна мець аднадумцаў. На майстар-класах або іншых мерапрыемствах мы знаёмімся адно з адным, дзелімся вопытам. Памятаю, калі прыехаў на чарговыя курсы павышэння кваліфікацыі ў Мінск, многія жанчыны на мяне паглядзелі са здзіўленнем, але, пагутарыўшы, зразумелі, што я такі ж, як яны. Сваю прафесію люблю: мы робім з жонкай іншых прыгажэйшымі і шчаслівейшымі. Прыемна, што блізкія і сябры станоўча аднесліся да майго выбару прафесіі. Галоўнае — каб справа была па душы. Мне мая падабаецца і мяняць яе не планую.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота дадзена героем.

Майстар-клас

МОДНЫ РОСПІС,

ці Чаго вы не ведалі пра кастамізацыю

З самага дзяцінства дваццацідвухгадовая Карына ДОЎНАР займаецца мастацтвам і не ўяўляе свайго жыцця без жывапісу. А зусім нядаўна яна адкрыла для сябе сферу кастамайзінгу адзення і ўжо дасягнула поспеху ў гэтым модным кірунку.

— Што гэта за кірунак?

— Ён даволі малады, асабліва ў нашай краіне. Калі казаць проста, то гэта ручны роспіс адзення. Упрыгожваць малюнкамі можна што заўгодна: ад звычайных футболак да вопраткі і абутку.

— А як вы пазнаёмілі ся з кастамайдзінгам?

— Навучацца мастацтву я пачала з дзесяці гадоў у Дзяржынскай мастацкай школе, вучылася там шэсць гадоў. Зразумела, што хачу звязаць сваё жыццё з маляваннем, і пасля школы паступіла ў Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў на дызайнера. Пасля пайшла працаваць у Дзяржынскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі. Менш чым праз год сышла ў дэкрэт, вось там і пачала сама вывучаць новыя віды мастацтва і пазнаёмілася з кастамізацыяй. Прайшла анлайн-курсы ў расійскай школе па гэтым кірунку, глядзела мноства відэаўрокаў і пачала набіваць руку на сваёй вопратцы і рэчах блізкіх. Паспяхова прайшоўшы ўсе этапы навучання, пачала працаваць у студыі кастамізацыі ў Мінску.

— Што самае галоўнае ў роспісе адзення?

— Адным з асноўных момантаў з'яўляецца правільны выбар фарбаў — звычайная акварэль або гуаш не падыдуць, бо склад і прызначэнне ў іх іншыя. У звычайнага акрылу, які выкарыстоўваюць для напісання карцін на паперы, не хапае элемента, які пры высыханні і замацаванні ўтварае эластычную плёнку. Яна патрэбна, каб малюнак пры хадзе, мыцці не рассыпаўся. Наогул, для кожнага віду матэрыялу трэба падбіраць фарбавальнік індывідуальна, улічваючы ўсе асаблівасці тканіны. Напрыклад, пры роспісе па скуры я працую з «Angelus» — гэта амерыканская фарба, яна падыходзіць як для натуральнай скуры, так і для скуразаменніка.

— Іншымі словамі, калі пры размалёўцы адзення выкарыстоўваць спецыяльную фарбу, то малюнак будзе служыць таксама як надрукаваны прынт?

— Амаль так, толькі, акрамя самой фарбы, важна ўлічваць асаблівую тэхніку яе высыхання на вопратцы. Акрыл на тканіне трэба замацоўваць высокімі тэмпературамі для таго, каб з'явілася гэтая эластычная плёнка, пра якую я распавяла раней, а таксама для таго, каб фарба лепш «пазнаёмілася» з «часцінкамі» тканіны. Без гэтага этапу малюнак доўга не пратрымаецца, якая б якасная фарба ні выкарыстоўвалася.

— Ад чаго залежыць цана выніковага прадукту?

— На гэта ўплывае складанасць малюнка і яго маштаб, а яшчэ матэрыял, на які будзе нанесена выява. Напрыклад, размаляваць шоўк будзе нашмат складаней, чым звычайную баваўняную футболку. Акрамя таго, улічваецца, што ўся праца ручная. А гэта заўсёды даражэй, бо эксклюзіў.

— На што абапіраецеся пры стварэнні эскізаў?

— Кожны кліент, звяртаючыся да мяне, ужо мае ў галаве пэўную ідэю або выразныя пажаданні. Я ўсё выслухоўваю і кампаную патрабаванні ў адзінае цэлае, дапрацоўваю, уносячы нешта сваё. Пасля гэтых этапаў раблю макет у графічнай праграме і адпраўляю кліенту і толькі пасля яго адабрэння пераношу малюнак на патрэбны аб'ект. Зараз я ўпэўнена ў сваім майстэрстве і якасці работы, таму бяруся за заказы любой складанасці.

— А ці былі сярод іх такія, калі вам давалі прастору для палёту фантазіі?

— Так, здараліся. Неяк прынеслі як зыходны матэрыял кашулю чорнага колеру, стапрацэнтная бавоўна. І была сказана толькі адна фраза: «Намаляваць нешта для кухара-шаўрміста, каб было зразумела, якой справай ён займаецца, і адпавядала тэматыцы ўстановы». У астатнім ніякіх патрабаванняў не было, таму я магла спаўна пакрэатывіць.

— Што б вы параілі пачаткоўцам-кастамайзерам?

— Перад тым, як пачаць распісваць вопратку ці абутак, лепш знайсці нейкі час, каб паглядзець у інтэрнэце, якія фарбы для кастамізацыі бываюць, вывучыць іх характарыстыкі і выбраць тую, якая па душы і падыдзе па фінансах. Гэтак жа вывучыць тыпы тканін, пэндзлі і перакладныя матэрыялы. Паспрабаваць розныя стылі і тэхнікі. Але самае галоўнае — не баяцца прыдумляць нешта сваё, не капіраваць іншых спецыялістаў і рухацца наперад, не звяртаючы ўвагі на страхі і няўпэўненасць.

Дар'я ДАРАШЧУК,
вучаніца 9 класа СШ № 36 г. Мінска.
Фота дадзена гераіняй.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРПЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.04.2021 г.

ДОБРА ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ

СПРЭЧКА

У гэтым доме састарэлых у адным пакоі жывуць дзве бабулі, Пятроўна і Сідараўна. Амаль равесніцы, год-другі туды-сюды нічога не значаць. Неяк узнікла паміж імі спрэчка, ды такая, што ажно суседзі пачалі грукаць у сцяну: ціха вы там, няўрымслівыя!.. Супакойцеся!..

А справа атрымалася такая. Пятроўна даўно жыве ў доме састарэлых, а Сідараўна з'явілася тут адносна нядаўна — з паўгода таму. Вядома, першая палічыла сябе на правах старажылкі галоўнай у пакойчыку, таму іншы раз вучыла Сідараўну, як і што рабіць, дзе і каму што казаць.

Магла і цыкнуць на яе, голас павысіць. Апошняя не крыўдавала, слухалася, ахвотна пагаджалася і дзякавала за навуку. А тут раптам Пятроўна выведала ад суседкі, што Сідараўна амаль усё жыццё прасядзела на шыі мужа, нідзе толкам не працавала, а калі дзеда не стала, дзеці прывезлі яе ў дом састарэлых: маўляў, тут тваё месца, мамуля.

— Дык якая, кажаш, у цябе пенсія была? — насцярожылася ў той вечар Пятроўна.

Паколькі хлусіць Сідараўна не ўмела, то адказала, як яно і ёсць: пенсія была ў яе сапраўды маленькая. Дакладней сказаць — мінімальная. І Пятроўна абурылася:

— Як гэта так?! Чаму такая несправядлівасць?! Дзе праўда?!

Сідараўна насцярожылася:

— Што не так, суседачка?

— А тое не так, даражэнькая мая... Я ўсё жыццё спіну гнула ў першым механічным цэху каля станка, а потым у кавальскім каля мартэна стаяла доўгі час нароўні з мужчынамі, зарабіла ўдвая большую пенсію, чым ты, і што ж гэта атрымліваецца?.. Прасвістала ты, можна сказаць, пад бокам у мужа жыццё, пралайдачыла, а спім мы сёння з табой на аднолькавых ложках, адны і тыя ж на іх коўдры і прасціны, адно і тое ж сёрбаем за сталом... Чаму такая несправядлівасць?

— Не разумею цябе, Пятроўна!..

— А што тут разумець! Пенсія ў мяне ў два разы большая, а вылічваюць з нас пароўну — па восемдзясят працэнтаў з яе. Па восемдзясят?

— Быццам так.

— «Быццам так». Дык я вось і кажу: чаму так? Чаму?.. А, маўчыш? Вядома, а што табе сказаць, калі ты сядзела раней на шыі мужа, а цяпер на маю шыю ўселася. Уселася і ногі звесіла. Не мулка?

— Цьфу на цябе, цьфу! Што ты такое кажаш? — Сідараўна замахала на Пятроўну рукамі. — А ты тут пры чым? Мяне дзяржава корміць і поіць. Думай, што кажаш!..

— А дзяржава — не мы самі хіба? — Пятроўна перавяла дыханне, катэгарычна заявіла. — Дзе б мне якога карэспандэнта знайсці? Ці на якую лінію да ўлады дабрацца? Пытанне, суседачка, сур'ёзнае: з цябе восемдзясят, з мяне столькі ж, а наяве атрымліваецца, што я ў дурнях аказалася... З чаго б такая несправядлівасць, людцы добрыя?!.. Мае восемдзясят працэнтаў пераплюнуць усе твае сто ў два разы!..

Бабулі яшчэ доўга спрачаліся ў той вечар. Заснулі позна. Ранічкай Пятроўна паглядзела на ложак Сідараўны, дзе тая мірна пасопвала.

«Спіць? Хай дрыхне. Чаго гэта я да яе ўчора прычапілася? — папракнула сябе. — У яе было сваё жыццё, у мяне — сваё, а сёння ў нас яно аднолькавае... Прачнецца — папрашу прабачэння. Павінюся. Што нам ужо тут дзяліць, старым перачніцам?»

І Пятроўна ўсміхнулася светлай раніцы, якая зазірнула праз акно ў іх маленькі, але ўтульны пакойчык...

ПРОМАХ

Няхай не крыўдуюць на мяне жанчыны. Але ўсё ж іншым разам трэба іх уважліва паслухаць, а зрабіць па-свойму. У чым я пераканаўся нядаўна, калі пачуў гісторыю свайго аднагрупніка па вайсковым вучылішчы. Больш за тое, чатыры гады мы жылі ў адным пакоі на чатырох чалавек. Хоць не скажу, што надта сябравалі, не: у яго былі дружбакі сярод іншых курсантаў, у мяне — таксама. Віктар родам з Харкава, ведаў, што вырас ён без бацькі.

Пасля заканчэння вучылішча апынуліся далёка адзін ад аднаго: ён у Мурманскай вобласці, я — у Ашхабадзе. Апошні раз бачыліся на трыццацігоддзі з дня выпуску ў Маскве. Усе былі ў цывільным адзенні, таму хто ў якім званні, паспрабуй зразумей. Аднак ведаў, што Віктар даслужыўся да палкоўніка. Малайчына, што тут казаць!

Ужо амаль перад самым звальненнем у запас Віктар служыў у ГСВГ (Група савецкіх войскаў у Германіі). Тут варта заўважыць, што жонка ў яго з Ленінграда (справа была да перайменавання горада ў Санкт-Пецярбург), і калі за паўгода да заканчэння тэрміну службы за мяжой яму прапанавалі замяніцца на горад на Няве, ёсць такая магчымасць, не кожнаму пашэнціць, ён адказаў па-вайсковаму коратка: прапанова сапраўды выдатная, параюся з жонкай, спадзяюся, яна абрадуецца — усё ж паедзем даслужваць у яе родны горад! Ну, парадуйцеся сабе. Чакаем адказу.

На другі дзень Віктар заявіў у аддзеле кадраў, што адмаўляецца...

Чаму — вы здагадаліся: жонка адгаварыла. «У нас, Віцюня, яшчэ паўгода служыць за мяжой, тут жа як-ніяк два аклады табе ідуць...Уяўляеш? Куды нам спяшацца, даражэнькі? Ды і не ўсё, што трэба, набылі. А тут такія магчымасці!..»

Вось так. А калі наспеў час мяняцца, то Віктар атрымаў прадпісанне прыбыць да новага месца службы... у Ташкент.

Так атрымалася, што ў той час, калі ён там служыў, амаль месяц я адпачываў і адначасова працаваў у Доме творчасці пісьменнікаў Узбекістана «Дурмон» і пажадаў, вядома ж, сустрэцца з Віктарам. На жаль, не атрымалася. Як паведамілі мне ў той часці, дзе ён служыў, палкоўнік Іванцоў выехаў у Расію — паспешліва шукаў новае месца службы, бо заканчваць яе тут не жадаў...

Знайшоў. У сталіцы Карэліі Петразаводску. З пасады палкоўніка пагадзіўся на маёрскую, але з умовай, што хутка атрымае кватэру. Кватэру атрымаў, у вайскоўцаў з гэтым праблем амаль ніколі не было. Трохпакаёвую. З вокнамі на Ладагу. Але ж жонку цягнула ў Ленінград.

Калі Віктар звольніўся ў запас, памянялі з горам папалам сваю шыкоўную кватэру на двухпакаёўку ў хрушчоўцы, і тое на Кранштат, дзе туліліся потым пяцёра чалавек — ён з жонкай, дачка з мужам і дзіцем...

А каб не паслухаўся ў свой час жонку, дажываў бы век у шыкоўнай — я ў гэтым перакананы — кватэры ў паўночнай сталіцы Расіі. Усё ж палкоўнік. І менш патраціў бы нерваў.

Так што не крыўдуйце, жанчыны... Вас слухаць, безумоўна, трэба, але не пашкодзіць мужчынам іншым разам жыць і сваім розумам.

ГЕНЕРАЛЬША

Раней гэтая жанчына зрэдчас хадзіла па тратауары якраз перад маімі вокнамі, і я бачыў яе, крыху прыгорбленую, так-сяк апранутую; было, што ўлетку, не звяртаючы ні на каго ўвагі, апусціўшы голаў, павольна, няспешна шоргала ў цёплых лямцавых старэнькіх ботах. Жабрачка — не болей. Жанчыны ж, якія звычайна сядзелі на лаве перад пад'ездам, моўчкі і пагардліва праводзілі яе паглядамі: генеральша некуды пайшла. Ну-ну...

І пэўны час маўчалі. Магчыма, які ўжо раз стараліся ўявіць мужа генеральшы, якога з іх ніхто і ніколі не бачыў, і ніяк не маглі змірыцца з думкай, што ў гэтай спітай жанчыны некалі было сямейнае шчасце, якое яна, калі верыць чуткам, сама растаптала, згубіла. Дакацілася, адным словам. І віной таму — віно, як гэта крыўдна і прыкра ні гучыць.

Гадоў колькі я не бачу гэтай жанчыны. Можа, адышла ў іншы свет, альбо знайшліся дзеці, дапаглі, у рэшце рэшт, ёй ачомацца, узяць сябе ў рукі, стаць на ногі? Даводзілася чуць, як жанчыны асуджалі таго генерала, які быццам камандуе недзе дывізіяй, а вось з адной жанчынай, некалі, відаць, і любай, справіцца не змог. «Што гэта за генерал такі?! Адкуль узяўся гэты слабак?! Што ён сабе думае, блазнюк?! Цьфу!»

Хоць жанчыны на лаве і не ведалі, ці былі ў генеральшы наогул дзеці, аднак ім таксама даставалася. Нехта нават выказаў меркаванне, што калі генерал прагнаў жонку, ён не быў яшчэ генералам, яму было да яго як да неба... Гэта потым ён стаў тым, кім стаў.

Што цікава, за ўвесь час, які жанчыны сустракалі і праводзілі паглядамі генеральшу, ніхто не асмеліўся з ёй загаварыць. Мо таму, што яна не давала падстаў — аніводнага разу з імі нават не павіталася, больш за тое, амаль і не глядзела ў бок жанчын: седзіце і сядзіце, мне не да вас, паненкі. Адным словам — генеральша!

Пазней у каго не цікавіўся пра генеральшу, чуў адзіны адказ: ніхто з іх таксама даўно не бачыў яе. Знікла. Было — і не стала. Засталася для ўсіх загадкай. Тады і падумалася: а можа, мы яе, людзі, самі прыдумалі? Ад няма чаго рабіць, га? Мо сапраўды не было ніякай генеральшы?

Не ведаю, як каму, а мне вельмі хацелася б, каб было іменна так...

КАРТА

Гадоў колькі таму ў цягніку ехаў з Гомеля ў Магілёў, дзе ў мяне былі справы ў драматычным тэатры, і неяк адразу, нібы ведалі адзін аднаго, разгаварыліся з суседам. Мужчына гасцяваў у гомельскай сястры, а цяпер ехаў да брата, якога, як прызнаўся, таксама даўно не бачыў.

— Жыву я ў Сібіры, — з непрыхаваным пачуццём гонару сказаў зямляк. — І даўно. А Беларусь сніцца... Вярнуцца ж — позна.... Дзеці маюць кватэры ў Новасібірску... Сын і дачка... Унукі пайшлі... Як іх пакінеш? На каго? Больш скажу, я ў свой час набыў жыллё ў Магілёве, побач з братам, але потым прадаў трохпакаёвую кватэру на Шміта... Ці шкадую? Калі шчыра: ёсць такое. Але нічога не паробіш — трэба ўсё ж жыць бліжэй да дзяцей... Добра там, дзе мы ёсць... Свае... Згодны?

Я кіўнуў. Пазней Мікола, так ён назваўся, успомніў вёску, у якой нарадзіўся і жыў, а мы недалёка ад яе праехалі, якраз перад самым Быхавам, і хоць яна з цягніка яму не паказалася — была на тым беразе Дняпра, але зачапіла сэрца.

— Гм, цікава атрымалася. Скажы каму — не паверыць. Перад урокам геаграфіі мы вешалі на дошку геаграфічную карту, і пакуль не было ў класе настаўніка, любілі правяраць свае веды... «А пакажы Кітай!», «А вось не знойдзеш Кубу!» Ну і гэтак далей. Адным словам, некаторыя нашы хлопчыкі і дзяўчынкі маглі знайсці на карце што заўгодна. Не адставаў ад іх і я. А неяк Валік, сусед па парце, загадаў, каб паказаў я Тынду, тады грымеў БАМ і гэты горад быў на слыху. Я знайшоў! І, ведаеш, так атрымалася, што знайшоў я гэты горад не толькі на карце, але і для жыцця. Так-так, цяпер там і жыву. Амаль усе будаўнікі стальной магістралі раз'ехаліся, а я застаўся. Дзеці клічуць у горад, пенсія добрая, грошы ёсць і каб кватэру там купіць, але не магу — прырос да Тынды. Жыву ў прыватным доме, маем жыўнасць. Жонка ў мяне хахлуха, баба таксама вясковая, так што трымаемся за свой кавалак зямлі...

Цягнік прыбыў на чыгуначны вакзал. Мы развіталіся як добрыя і старыя знаёмыя. Забыў вось толькі Міколу сказаць, што тапталіся і мы перад геаграфічнай картай — а як жа, загадвалі адзін аднаму паказаць краіны-гарады. Хоць ён, несумненна, і сам пра гэта ведаў. Мы, дзятва, асабліва вясковая, мелі вялікае і адзінае жаданне — быў хутчэй знайсці не толькі на карце сваё месца на зямлі.

Што потым і зрабілі.

Васіль ТКАЧОЎ.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

ОАО «МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ»

ЗА 2020 ГОД

Месторасположение: 220037, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, тел. +37517 245-83-12

Количество акционеров: всего – 389, в том числе юр. лиц – 5, физ. лиц – 384.

Основной вид деятельности – строительство линий электропередачи и телекоммуникаций.

Среднесписочная численность работающих – 269 человек, **УНП** – 100068131.

Доля государства в уставном фонде (всего, в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	57 102	39,93
Коммунальная – всего	-	-
В том числе: областная	-	-
районная	-	-
городская	-	-

Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	112,57	179,94
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	112,42	179,94
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	0,78	1,26
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги)	X	X	X
типа_____	рублей	-	-
типа_____	рублей	-	-
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	0,78	1,26
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги)	X	X	X
типа_____	рублей	-	-
типа_____	рублей	-	-
Период, за который выплачивались дивиденды	месяц, квартал, год	За 2019 год	X
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год	26.03.2020	X
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год	с 22.04.2020 по 20.06.2020, государству до 22.04.2020	X
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	64,84	58,18
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук	-	-
В том числе: поступившие в распоряжение общества:	X	X	X
дата зачисления акций на счет «депо» общества / количество акций	штук	срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества	
- / -	-	-	-
приобретенные в целях сокращения общего количества акций:	X	X	X
дата зачисления акций на счет «депо» общества / количество акций	штук	X	X
- / -	-	-	-

Информация о задолженности

Наименование показателя	Ед.изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	тыс. руб.	237	19
Просроченная кредиторская задолженность	тыс. руб.	-	0

Отдельные финансовые результаты деятельности

Наименование показателей	Ед. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных обязательных платежей)	тыс. руб.	16 802	14 684
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	тыс. руб.	14 555	12 758
Прибыль (убыток) – всего	тыс. руб.	1 290	856
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции (работ, услуг)	тыс. руб.	2 247	1 926
прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	тыс. руб.	-257	-363
прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	тыс. руб.	-700	-707
Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	тыс. руб.	369	293
Чистая прибыль	тыс. руб.	921	563
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тыс. руб.	3 936	3 133

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2020 года

Активы	Код строки	На 31 декабря 2020 года	На 31 декабря 2019 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	4 341	4 083
Нематериальные активы	120	5	7
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	5	2
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**4 351**	**4 092**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 250	997
в том числе: материалы	211	1 185	963
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	65	34
готовая продукция и товары	214		
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	48	29
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240		-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	2 662	2 207
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	2 491	2 101
Прочие краткосрочные активы	280	-	1
ИТОГО по разделу II	**290**	**6 451**	**5 335**
БАЛАНС	**300**	**10 802**	**9 427**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	4 505	4 505
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		-
Резервный капитал	440	105	99
Добавочный капитал	450	727	583
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	3 936	3 133
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**9 273**	**8 320**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	1 529	1 107
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	618	294
по авансам полученным	632	2	2
по налогам и сборам	633	496	426
по социальному страхованию и обеспечению	634	73	95
